САМАЯ ПОЎНАЯ ТЭЛЕПРАГРАМА НА ТЫДЗЕНЬ: 31 КАНАЛ

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 СНЕЖНЯ 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 240
(27104)
Кошт 800 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.




# «ВЫХАД НА ЎСТОЙЛІВАЕ ПЕРАВЫШЭННЕ ЭКСПАРТУ НАД ІМПАРТАМ — ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ»


Фота БЕЛТА.

**Учора ў сталічным Палацы Рэспублікі распачаў работу пастаянна дзейны семінар кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржорганаў. Сёлета ён прайшоў непасрэдна пад кіраўніцтвам Прэзідэнта Беларусі, а ў цэнтры ўвагі яго ўдзельнікаў апынулася тэма імпартазамяшчэння.**

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, тэма семінара прадыктавана самім жыццём: сёння імпартазамяшчэнне з'яўляецца важнейшым дзяржаўным прыярытэтам, ад рэалізацыі якога залежыць эканамічная бяспека краіны. Красамоўнае пацвярджэнне гэтаму — сітуацыя, якая сёлета склалася на валютным і спажывецкім рынках. Яе наступствы адчулі на сабе і прадпрыемствы, і ўсё насельніцтва. Адной з асноўных прычын нястачы валюты з'яўляецца высокая імпартаёмістасць нашай эканомікі. На жаль, пакуль атрымліваецца так, што ўсе заробленыя за кошт экспарту сродкі ідуць на закупку тавараў і паслуг у іншых дзяржаў. Праўда, сёлетні год стаў сапраўды адметным — прыток экспартнай выручкі паставіў рэкорд — больш за 35 млрд долараў ЗША. Аднак і гэтых велізарных сродкаў не хапае, каб аплаціць увесь імпарт.

Задача, пастаўленая кіраўніком дзяржавы, і рашэнні чацвёртага Усебеларускага сходу, па сутнасці, не выкананы. Паводле ацэнак Прэзідэнта, імпартазамяшчэнне так і не стала асноўным, жыццёва важным пытаннем для многіх кіраўнікоў, асабліва ў рэгіёнах. Статыстыка ўражвае: імпарт да ВУП складае 75 працэнтаў. Гэта значыць, тры чвэрці заробленага трэба аддаць на закупку імпарту!

«Што тады застанецца на выплату заробкаў і пенсій, якія неабходна павышаць? Як павялічыць фінансаванне адукацыі, аховы здароўя, навукі? Як будзем будаваць жыллё?..» — задаў жорсткія пытанні Аляксандр Лукашэнка.

Таму па-ранейшаму стратэгічнай задачай застаецца выхад на станоўчае сальда знешняга гандлю.

На працягу апошняга дзесяцігоддзя ў краіне рэалізоўваліся дзяржаўныя галіновыя і рэгіянальныя праграмы імпартазамяшчэння. Асноўнымі іх мэтамі было зніжэнне матэрыяльных і энергетычных (ільвіная доля экспарту) выдаткаў, адмова і замяшчэнне некрытычнага імпарту, пашырэнне экспарту. У якасці станоўчага прыкладу кіраўнік дзяржавы прывёў папяровую фабрыку «Спартак», на якой пасля радыкальнай мадэрнізацыі пачалі выпускаць імпартазамяшчальную прадукцыю не толькі на ўнутраны рынак, але і пастаўляць яе за мяжу. Аналагічныя прыклады паспяховай работы ў гэтым кірунку ёсць і ў іншых рэгіёнах. З многімі з іх удзельнікі семінара маглі на свае вочы азнаёміцца на наладжанай у фае Палаца Рэспублікі выставе. Разам з тым цалкам задача па істотным зніжэнні імпартаёмістасці эканомікі і выхадзе на станоўчае сальда не была вырашана. За апошнюю пяцігодку таварная структура беларускага экспарту практычна не змянілася і па-ранейшаму характарызуецца вялікай доляй энергетычных тавараў і сціплай колькасцю прамысловай высокатэхналагічнай прадукцыі.

Нават прадукцыя, якая вырабляецца ў рамках рэалізацыі імпартазамяшчальных праектаў, мела ўзровень імпартнага складніка ад 70 да 90 працэнтаў і прынцыпова не аказвала ўплыву на скарачэнне адмоўнага сальда. Не змянілася і імпартаёмістасць спажывецкага рынку. У 2010 годзе, як і пяць гадоў таму, імпарт спажывецкіх тавараў складаў каля 25 працэнтаў рознічнага тавараабароту.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, час паказаў, што самі праграмы імпартазамяшчэння складаліся фармальна і не змяшчалі праектаў, значных для сектараў эканомікі і рэгіёнаў. Няма станоўчых вынікаў і нягледзячы на шэраг іншых захадаў.

«Станоўчыя тэндэнцыі ў знешнім гандлі сёлета не павінны нікога расслабляць», — падкрэсліў Прэзідэнт. У многім яны абумоўлены карэкціроўкай курсу рубля, у выніку якой рэзка падаражэў імпарт. Таму набываць за мяжой сталі менш, а экспарт, наадварот, павялічыўся.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, такая сітуацыя доўга не працягнецца.

«Прыбыткі насельніцтва, зарплаты і пенсіі будзем паслядоўна павышаць. Ужо на пачатку 2012 года ў чарговы раз яны вырастуць, — заявіў Прэзідэнт. — Таму нашы вытворцы павінны дабіцца, каб людзі патрацілі прыбаўку даходаў на набыццё айчынных тавараў».

Прычым ніякіх забарон на спажывецкім рынку ўводзіцца не будзе. Кіраўнік дзяржавы глыбока перакананы, што перамагчы і прадаць свой тавар як унутры краіны, так і на экспарт можна выключна ў канкурэнтнай барацьбе з імпартам, праз павышэнне якасці і спажывецкіх уласцівасцяў прадукцыі.

Прычым аналізаваць трэба кожную пазіцыю, кожную таварную групу, кожны долар імпарту. Замяшчаючы імпартны тавар, вырабляючы канкурэнтаздольную прадукцыю, мы не толькі плацім менш валюты іншым, але і больш зарабляем самі.

«А гэта — прыбыткі нашых людзей, занятасць, сацыяльная і эканамічная стабільнасць», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць нерэальным і непатрэбным «усё да капейчыны» замясціць айчынным таварам. Аднак плацежаздольны попыт нашых людзей трэба задаволіць, у тым ліку і за кошт стварэння новых магутнасцяў. Тым больш што для нас адкрыты велізарны рынак Расіі і Казахстана, з якімі ў Мытным саюзе — свабодны гандаль. Беларусь тут у больш выгадным становішчы, чым вытворцы з трэціх краін, якім давядзецца плаціць мытную пошліну.

Асобна кіраўнік дзяржавы спыніўся на імпартазамяшчальным патэнцыяле рэгіёнаў.

«Многае з таго, што мы імпартуем у краіну, элементарна вырабіць ва ўмовах малых гарадоў і сельскіх населеных пунктаў, выкарыстоўваючы маёмасць, будынкі і збудаванні, якія ўжо маюцца. Для гэтага дастаткова навесці парадак і арганізаваць вытворчасць. Пакуль жа па імпарце цягнем з Польшчы, В'етнама, Кітая кадкі для кветак, кашолкі для бялізны, тапарышчы, граблі і нават зубачысткі!», — абурыўся Прэзідэнт.

Нават ва ўмовах дарагога імпарту сёлета ўвезена яблыкаў на 40 млн долараў ЗША, макароны і крупаў — на 70 мільёнаў долараў, кандытарскіх вырабаў, шакаладу і цукерак — амаль на 100 млн, адзення і абутку — больш як на 200 млн долараў, лекаў — на суму звыш 300 млн долараў.


Фота БЕЛТА.

З гэтай нагоды Аляксандр Лукашэнка прапанаваў старшыням райвыканкамаў і аблвыканкамаў на пленарным пасяджэнні і падчас работы ў групах далажыць, колькі на месцах створана вытворчасцяў, якія замяшчаюць імпарт, дзе іх прадукцыя на паліцах крамаў, колькі засвоілі тавараў праз ініцыятыву людзей, рамесніцтва...

Паводле ацэнкі Прэзідэнта, вельмі нізкую эфектыўнасць працы паказвае спажывецкая кааперацыя. Асабліва ў лясной і плодаагароднінай прадукцыі. Саленні, марынады, кансерваваныя ягады, грыбы, гародніна — гэта дарагі экспартны тавар, а мы яго амаль не вырабляем і нават наадварот — імпартуем. Дары нашага лесу прадаём за мяжу за капейкі...

Абсалютная большасць нашага імпарту — больш за 70 працэнтаў — гэта энерганосьбіты, сыравіна, металы... І цэны на іх растуць кожны год.

«Таму выхад у нас адзін — эканоміць, эканоміць і яшчэ раз эканоміць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта не проста патрабаванне, гэта павінна стаць ладам жыцця, стылем гаспадарання».

Рэзерваў тут сапраўды нямала: спажыванне таго ж газу на аднаго занятага ў Беларусі амаль удвая вышэйшае, чым у Германіі, у паўтара — чым у Італіі і Англіі. Энергаёмістасць эканомікі хоць і знізілася, але ўсё яшчэ ў паўтара раза вышэй, чым у развітых краінах. Таму менавіта з кіраўніцкай вертыкаллю, кадрамі, якія павінны забяспечыць напружанне і жорсткую дысцыпліну, эканомію, мабілізаваць людзей, Аляксандр Лукашэнка звязвае дасягненне пастаўленых мэтаў. Пакуль гэтага няма, бо расхлябанасці хапае і ў саміх кіраўнікоў.

Прэзідэнт агучыў вынікі некаторых праверак, якія выкрылі жудасную бесгаспадарнасць. Так, выпадкі адзінкавыя, так бы мовіць, прыватныя. Аднак у маштабах краіны — гэта тысячы і мільёны тон перарасходу нафты, газу, металаў. Менавіта з іх складваецца рэальная эканоміка, канчатковы вынік работы.

«Кожны з прысутных павінен зразумець і давесці да ўсіх падначаленых — толькі ад нас саміх залежыць узровень нашага дабрабыту, будучыня і незалежнасць краіны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Пытаннем нацыянальнай бяспекі назваў Аляксандр Лукашэнка выхад на ўстойлівае перавышэнне экспарту над імпартам. У сувязі з гэтым Прэзідэнт засяродзіў увагу ўдзельнікаў семінара на праблеме пастаўкі тавараў з нізкай ступенню перапрацоўкі. У якасці аднаго з прыкладаў кіраўнік дзяржавы прывёў экспарт паперы адной з мадэрнізаваных экспартаарыентаваных фабрык, якую ён днямі наведаў. Атрымліваецца, што мы экспартуем паперу, а потым самі закупляем сурвэткі і іншыя тавары, якія нехта вырабіў з нашай жа паперы! На думку Аляксандра Лукашэнкі, у такіх выпадках трэба «дадаць» для паглыблення перапрацоўкі.

Таксама Прэзідэнт запатрабаваў больш эфектыўна выкарыстоўваць мясцовую сыравіну, у тым ліку скураную і пушную. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што велізарныя аб'ёмы сыравіны вывозяцца за мяжу за бясцэнак, а потым вяртаюцца да нас у выглядзе гатовай прадукцыі, у тым ліку і футраў.

«Усю сыравіну трэба перапрацоўваць у краіне — і скураную, і пушную, і вырабляць затым з яе прадукцыю», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Сярод іншых жорсткіх пытанняў, якія прагучалі ад кіраўніка дзяржавы, было і тое, што датычылася адсутнасці вынікаў ад Нацыянальнай праграмы развіцця экспарту. На працягу ўсяго перыяду яе рэалізацыі сальда знешняга гандлю было адмоўным і мела ўстойлівую тэндэнцыю да пагаршэння. Імпарт рос такімі тэмпамі і ў такіх прапорцыях, што ў тры разы перавысіў парог эканамічнай бяспекі.

СТАР. 2


Фота БЕЛТА.

На СТАА «Лекфарм» (Лагойск) запушчана новая лінія па вытворчасці лекаў. У цырымоніі пуску лініі ўзяла ўдзел адна з вучэбных груп семінара кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў на чале з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Макеем.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЧАРАДА СВЯТАЎ У КЛІМАВІЧАХ СТАРТУЕ РАНЕЙ

**20 снежня раённы цэнтр адзначыць свой юбілей: у гэты дзень гораду на беларуска-расійскім памежжы спаўняецца 430 гадоў.**

Першая пісьмовая згадка пазначана 1851 годам: за тым часам Клімавічы былі цэнтрам староства ў Мсціслаўскім ваяводстве. Дакумент, дату якога клімаўчане прынялі за дзень нараджэння свайго горада, знайшлі калісьці ў Ленінградскім абласным архіве. Цікава, што там расказваецца пра «палюбоўны суд» у размежаванні зямлі паміж уладальнікам вёсак Паўлам Аўсеевічам Асмалоўскім і Клімавіцкім старостам.

Усе святочныя мерапрыемствы з нагоды юбілею запланаваны ў раённым цэнтры на суботу 17 снежня. Будуць літаратурныя чытанні, экскурсіі, выставы. Раённая арганізацыя «Белая Русь» уручыць падарункі клімавіцкім бацькам, у якіх сёлета нарадзіліся дзеці з 10 па 20 снежня. А 11 гадзіне народнае гулянне пачнецца на цэнтральнай плошчы горада ля будынка райвыканкама. А 14-й — святочны канцэрт у раённым цэнтры культуры. Увечары ў гарадскім парку будуць танцы і феерверк. Віншуем Клімавічы з юбілеем!

**Ілона ІВАНОВА.**

ЯК НАС ДУРАЦЬ

### ТАННА БУДАВАЦЬ — ДОРАГА

**Крымінальная справа заведзена ў дачыненні да 43-гадовай мінчанкі, якая пад маркай аказання садзейнічання ў будаўніцтве кватэр завалодала грашыма даверлівых кліентаў. Ёй можа пагражаць да 12 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.**

Як расказалі ў Кастрычніцкім РУУС, зламысніцы ўдалося пераканаць многіх сваіх знаёмых у тым, што яна можа дапамагчы ахвотным пабудаваць кватэру па ўмераных цэнах. Як правіла, здзелцы папярэднічала азнаямленчая сустрэча, на якой абмяркоўваліся ўмовы. Прычым яны былі настолькі прывабнымі, што кліенты, не раздумваючы, ішлі на супрацоўніцтва. Аднак пасля перадачы агаворанай сумы справы спыняліся. Пры гэтым зламысніца тлумачыла прамаруджванне вельмі важкімі суб'ектыўнымі і аб'ектыўнымі прычынамі. Вадзіць за нос даверлівых грамадзян ёй удавалася даволі доўга. Як мяркуюць следчыя, схема падману была распрацавана яшчэ ў 2007 годзе. За гэты час зламысніца паклала ў кішэню больш як 1,3 млрд рублёў.

**Алена КАСЬЯН,** *«Мінск—Навіны».*

### ВІНАГРАД НА 324 МІЛЬЁНЫ

Недалёка ад вёскі Клясціцы Расонскага раёна супрацоўнікі ДАІ затрымалі аўтамабіль «Вольва», якім кіраваў жыхар Столінскага раёна. Мужчына без адпаведных дакументаў перавозіў 18 тон вінаграду. «Безгаспадарчы» вінаград агульным коштам 324 мільёны рублёў канфіскавалі.

### ПАД ВУГАЛЕМ — ЦЫГАРЭТЫ НА 160 МІЛЬЁНАЎ

**Ноччу каля вёскі Ліпаўка Верхнядзвінскага раёна, недалёка ад мяжы, беларускі пагранічны нарад затрымаў траіх людзей без дакументаў. Затрыманыя, якія прадставіліся грамадзянамі Латвіі, неслі шэсць каробак цыгарэт беларускай вытворчасці. Дзвюма гадзінамі пазней былі выяўлены сляды трох чалавек, якія вялі з Латвіі ў Беларусь.**

А ў пункце пропуску «Бігосава-1» у грузавым цягніку, які з Полацка накіроўваўся ў Даўгаўпілс, пагранічнікі знайшлі пад вугалем 121 каробку з цыгарэтамі (60,5 тысячы пачкаў з акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь) коштам больш за 160 мільёнаў рублёў. Цыгарэты канфіскавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### МАЗЫРСКІ ВОЛАТ-ВАЛУН

Самы вялікі камень-валун знойдзены нядаўна ў ходзе земляных работ у раёне вёскі Дразды Мазырскага раёна. Вага гіганцкага каменя — больш за 90 тон. Валун шырынёй пяць метраў і вышынёй тры метры ўстанавілі ў мікраараёне № 4 г. Мазыра. Цяпер ён стаў мясцовай славутасцю. Мясцовыя ўлады прынялі рашэнне прымацаваць на камені спецыяльную дошку, на якой будуць пазначаны памятныя даты горада, або неяк па-іншаму акультурыць яго з мэтай прыцягнення турыстаў у горад над Прыпяццю. Па ацэнках спецыялістаў, на тэрыторыю Беларусі вялізны валун прыйшоў з ледавіком 12—15 тысяч гадоў таму.


Фота БЕЛТА.

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

Павіншуйце
Вашых партнёраў
з Новым годам і Калядамі!
Сэрвіс друку
НАВАГОДНІХ
фірменных ПАШТОВАК
InterPrint.by
офіс (017) 298 41 68
МТС (029) 775 57 18
Мабільныя тэлефоны SNAMI®
SNAMI.BY
ООО «ТЦ СНАМИ» УНП 100705382

# ЗДЫМУ ПАКОЙЧЫК НА ТРАІХ?

Арэнда жылля

## Прагназуецца, што да сярэдзіны лютага арэнда неліквідных кватэр патаннее яшчэ на 20—30 долараў

**Сусветны крызіс і новы кошт замежнай валюты даволі моцна ўдарылі па кішэні бескватэрных жыхароў сталіцы. Заробкі мы атрымліваем у айчыннай валюце, а вось плаціць за кватэру трэба «зялёнымі» або па курсе, які...**

Калі летась каля 30 працэнтаў кватарантаў былі маладыя пары, якія не хацелі жыць разам з бацькамі або жылі ў статусе грамадзянскага шлюбу, то цяпер сітуацыя цалкам змянілася. Маладыя зарэгістраваныя пары пачалі масава вяртацца ў кватэры бацькоў, а «свабодныя» шлюбы ў выпадках, калі фінансы спяваюць рамансы, развальваюцца вельмі хутка. Спецыялісты рынку адзначаюць, што частка такіх сем'яў цяпер пачала здымаць больш танныя кватэры ці ўвогуле асобныя пакойчыкі.



### Слабенькія аднапакаёўкі — за 150—160 USD

Цяпер кліенты агенцтваў нерухомасці ўсё часцей заказваюць жыллё мінімальнага цэнавага дыяпазону. Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» начальнік арэнды Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКОДАН» Аксана Лукашэвіч, маленькія аднапакаёвыя «хрушчоўкі» са старой мэбляй ці часткова мэбляваныя маюць мінімальны кошт арэнды аднапакаёвых кватэр у межах 150—160 долараў у далёкіх або загазаваных раёнах. Сёння такіх танных кватэр вельмі мала, таму новыя жыльцы з'яўляюцца на працягу некалькіх дзён.

Сярэдні кошт стандартных аднапакаёвых кватэр з больш-менш прывабнай мэбляй складае ўжо 180—210 долараў. Новыя і вялікія па плошчы, але пустыя кватэры ў новабудоўлях прапануюцца кліентам за 170—200 долараў. Сапраўды якасныя стандартныя аднапакаёўкі з сучаснымі кухнямі і пральнай машынай маюць цэннік ужо ад 250 да 300 долараў. Элітныя аднапакаёвыя кватэры-студыі плошчай 60—80 квадратных метраў, дзе практычна няма перагародак, а жыллё падзелена на зоны мэбляй, каштуюць і цяпер 600—700 долараў.

### З'явіліся двухпакаёўкі і за 190 USD

Сярэдні кошт арэнды стандартных двухпакаёвых кватэр складае 200—250 долараў. Блізкасць да метро дабаўляе да гэтага цэнніка яшчэ прыкладна 50—100 долараў. Разам з тым на рынку арэнды часам сустракаюцца і маленькія двухпакаёўкі, якія патрабуюць дробнага рамонту, ужо і за 190 долараў. Якасныя двухпакаёўкі з сучаснай мэбляй і пральнай машынай каштуюць 300—350 долараў. Элітныя двухпакаёўкі агульнай плошчай ад 80 да 100 квадратных метраў маюць цэннік ад 500 да 1000 долараў, а цалкам «упакаваныя» кватэры з дарагой мэбляй і сучаснай бытавой тэхнікай прапануюцца ў арэнду за 1,5—2 тысячы долараў.

Трохпакаёвыя кватэры сярэдняй якасці карыстаюцца ў кватарантаў мінімальным попытам, таму цэннік на іх усяго на 20—30 долараў вышэй, чым на двухпакаёўкі. Нават сем'і з дзецьмі часцей выбіраюць якасную двухпакаёвую кватэру за 300 долараў, чым вялікую трохпакаёўку за такі кошт. Гэта зразумела, бо кватплата за такое жыллё менавіта зімой сур'ёзна б'е па кішэні кватарантаў.

### Упэўнены попыт толькі на танныя пакоі

Наш эксперт адзначае, што ў апошнія два тыдні на рынак арэнды трапіла вялікая колькасць здымных кватэр, але попыт на іх мінімальны. Калі за тыдзень на рынку з'яўляецца каля 2 тысяч «свежых» здымных кватэр, то за гэты час кватарантаў атрымліваюць толькі недзе 100 з іх. Астатнія 1900 кватэр проста «гуляюць» па рынку і застаюцца пустымі. Кліенты не здымаюць іх, бо дорага, а гаспадары пакуль на зніжкі не ідуць. Аксана Лукашэвіч упэўнена, што калі такая тэндэнцыя захаваецца і надалей, то ў студзені—лютым будзе назірацца чарговае патанненне сярэдніх па якасці кватэр. А вось кватэры з добрым рамонтам і жыллё эліт-класа таннець не будзе нават тады. Гаспадары такога жылля чакаюць менавіта свайго самавітага кліента і сумнеўным кватарантам за грашы здаваць кватэры не будуць.

Слабенькія і сярэднія па якасці невялікія кватэры да сярэдзіны лютага могуць патаннець прыкладна на 20—30 долараў. Тады мінімальны цэннік нават стандартных аднапакаёвых кватэр з мэбляй можа знізіцца да 130—150 долараў.

Пра тое, што нават мінскія заробкі не заўсёды дазваляюць людзям здымаць кватэры, сведчыць устойлівы попыт на асобныя пакоі ў шматпакаёўках. Часам асобны пакой у кватэры здымае нават маладая сям'я з дзіцем. Гаспадары такога жылля ўжо перагледзелі свае цэннікі. Арэнда асобнага пакоя каштуе звычайна 450—500 тысяч рублёў, а яшчэ летам было не менш як 100 долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### У НАСТУП НА ХВАРОБЫ СЭРЦА

**У Магілёве лепшыя кардыяхірургі Беларусі і замежжа сабраліся на рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю.**

Медыкі абмяркоўваюць розныя праблемы кардыяхірургіі. Спецыялісты Расіі, Польшчы і Літвы правялі майстар-класы, зрабілі найскладанейшыя аперацыі на сэрцы. На канферэнцыі арганізавалі трансляцыю ў рэжыме анлайн для беларускіх дактароў, запрошаных з усіх рэгіёнаў краіны.

У нашай краіне кардыяхірургія апошнім часам дынамічна развіваецца. Напрыклад, у Магілёўскай абласной бальніцы праводзяцца паспяховыя аперацыі на адкрытым сэрцы. Пільная ўвага менавіта сардэчным справам поўнасцю апраўдана: сярод прычын смяротнасці насельніцтва ўжо доўгі час трымаюць сумнае лідарства хваробы сэрцаў і сасудаў.

**Ілона ІВАНОВА.**




БЕЛАРУСБАНК

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,**
расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 26 ДЕКАБРЯ 2011 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. Об утверждении решения о выпуске дополнительных простых (обыкновенных) акций ОАО «АСБ Беларусбанк».
2. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «АСБ Беларусбанк».
3. О внесении изменений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 23 декабря), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 26 декабря) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – 23 декабря 2011 года.
Телефоны для справок: (8 017) 218 82 43, 218 84 73.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.12.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 8 450,00 | 1 чэшская крона | 430,22 |
| ▼ 1 еўра | 10 990,00 | 1 польскі злоты | 2 421,79 |
| 1 латвійскі лат | 15 779,65 | ▼ 1 расійскі рубель | 265,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 188,38 | 1 украінская грыўня | 1 053,81 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 31,8957 |
| 10 UAH | 39,7776 |
| 10000 BYR | 37,7464 |
| EUR | 41,4389 |

ISSN 1990 - 763X

# «ВЫХАД НА ЎСТОЙЛІВАЕ ПЕРАВЫШЭННЕ ЭКСПАРТУ НАД ІМПАРТАМ — ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ»



**Вучэбная група ўдзельнікаў семінара начале з прэм'ер-міністрам Міхаілам Мясніковічам наведала СТАА «Хенкель Баўтэхнік» у Заслаўі.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Усю мінулую пяцігодку назіралася ўстойлівае зніжэнне долі экспарту ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці. У 2005 годзе стартавалі з 57% экспарту прадукцыі, а ў 2010-м закончылі з 46%. І гэта пры тым, што аб'ёмы вытворчасці актыўна прырасталі.

Прэзідэнт заклікаў удзельнікаў семінара не проста да самакрытычнай размовы, а да «мазгавога штурму», каб у выніку двух дзён працы кожны меў дакладны план — што і як павінен рабіць на сваім працоўным месцы, як мабілізаваць на рашэнне складаных задач падначаленых.

Падчас свайго выступлення прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч заклікаў кіраўнікоў беларускіх прадпрыемстваў найхутчэй і ў поўнай ступені скарыстацца тымі выгодамі, якія адкрываюцца са стварэннем Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана.

«Нашы прадпрыемствы і галіны павінны ў поўным аб'ёме скарыстацца магчымасцямі, якія адкрывае АЭП, бо ў адзін час сышліся тры спрыяльныя для нас фактары: адзіны рынак з высокай тарыфнай абаронай, рост плацежаздольнасці нашых партнёраў, спрыяльны для экспарту абменны курс беларускага рубля», — заявіў прэм'ер.

Ён патлумачыў, што для эфектыўнай рэалізацыі праектаў па стварэнні ў Беларусі імпартазамяшчальных вытворчасцяў неабходны такі фактар, як маштабнасць рынку збыту.

Аднак, папярэдзіў Міхаіл Мясніковіч, «акно магчымасцяў» хутка зачыніцца: максімум, што ў нас ёсць, — бліжэйшая пяцігодка. Таму часу на разварушванне няма зусім.

У прыватнасці, ён чакае змянення тарыфаў пры імпарце асобных відаў тавараў. Так, напрыклад, уступленне Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю прывядзе да зніжэння ўзроўню тарыфнай абароны па шэрагу тавараў у бліжэйшыя 3-7 гадоў. Як вынік — супрацьстаяць імпарту давядзецца толькі за кошт павышэння канкурэнтаздольнасці і якасці прадукцыі.

Таксама прэм'ер-міністр Беларусі звярнуў увагу, што партнёры па Мытным саюзе рэалізуюць праграму па выхадзе на самазабеспячэнне па асобных відах тавараў, што таксама ўяўляе пагрозу беларускім прадпрыемствам, якія пастаўляюць гэтую прадукцыю ў Расію і Казахстан.

«Умацоўвайцеся і рыхтуйцеся да самай жорсткай канкурэнцыі, нават на рынку АЭП», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Ён таксама ўказаў на важнасць інтэграцыі беларускіх прадпрыемстваў не толькі з партнёрамі па Мытным саюзе, але і з трэцімі краінамі, ТНК. Паводле слоў прэм'ер-міністра, скочванне сусветнай эканомікі да рэцэсіі не спрыяе зліццю і прыцягненню інвестыцый, а таму трэба максімальна скарыстацца тымі магчымасцямі, якія маюцца зараз.

Міхаіл Мясніковіч назваў памылковым меркаванне пра тое, што ўдзел Расіі ці іншага бізнэсу ў прыватызацыі ў Беларусі вядзе да рэйдарства і іншых непрыемнасцяў, ледзь не да закрыцця беларускіх прадпрыемстваў. Трэба разумець, што выкінуць з агульнага еўразійскага рынку некаторыя нашы прадпрыемствы калегі могуць і без набыцця іх актываў, развіваючы аналагі на сваёй тэрыторыі. Інтэграцыйныя працэсы не азначаюць, што нашы прадпрыемствы знікнуць ці стануць прыдаткамі нейкіх вытворчасцяў — размова ідзе аб партнёрстве і аптымізацыі рынкавых рашэнняў.

Прэзідэнт Беларусі запатрабаваў ад чыноўнікаў большай эфектыўнасці і ініцыятыўнасці ў працы.

«Пачынайце варушыцца. Улады на тое і існуюць, каб прымушаць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Праўду кажа прэм'ер: мы не абаронімся, не адгародзім сябе мытнымі пошлінамі і г. д. Нас проста раздушаць, таму што ў нас адкрытая эканоміка».

Кіраўнік дзяржавы таксама раскрытыкаваў працу мясцовых органаў улады. Паводле яго слоў, на ўзроўні губернатараў і міністраў «гайкі зацiснулі», але старшыні гар- і райвыканкамаў поўнасцю выключаны са справы. Ён падкрэсліў, што мясцовыя ўлады павінны кантраляваць і прымушаць укараняць у вытворчасць сучасныя тэхналогіі.

Пра тое, як гэта адбываецца на ўзроўні вобласці — Магілёўскай, і асобнага раёна — Бярэзінскага, удзельнікам семінара расказалі губернатар Пётр Руднік і старшыня райвыканкама Юрый Наркевіч.

У другой палове дня ўдзельнікі семінара ўзялі ўдзел у практычных занятках на канкрэтных аб'ектах Мінска і Мінскай вобласці.

**Сяргей ПРОТАС.**
**Фотаздымкі БЕЛТА.**



**Адна з вучэбных груп пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоля Рубінава і першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Радзькова наведала ААТ «Фармтэхналогія».**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ НУРСУЛТАНА НАЗАРБАЕВА З 20-ГОДДЗЕМ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ КАЗАХСТАНА

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан Нурсултана Назарбаева са знамянальнай датай у найноўшай гісторыі гэтай краіны — 20-годдзем незалежнасці.**

«Дзякуючы працавітасці і патрыятызму казахстанскага народа вашай краіне за гэтыя гады ўдалося дасягнуць сапраўды ўражвальных вынікаў ва ўмацаванні дзяржаўнасці, сацыяльна-эканамічным развіцці, у замацаванні за Казахстанам іміджу аўтарытэтнага ўдзельніка міжнародных адносін, які робіць важны ўнёсак у інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы, у забеспячэнне глабальнай і рэгіянальнай бяспекі», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што адносіны паміж нашымі дзяржавамі будуць і ў далейшым развівацца на аснове сяброўства, павагі, узаемаразумення і даверу. Прэзідэнт перакананы, што Адзіная эканамічная прастора створыць яшчэ больш спрыяльныя ўмовы для сумеснай эфектыўнай работы дружалюбных краін у мэтах павышэння ўзроўню жыцця грамадзян і будзе садзейнічаць наданню новай глыбіні беларуска-казахстанскаму стратэгічнаму партнёрству.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Год — дастатковы тэрмін для абмену пасведчанняў пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС

**«Абмен пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на пасведчанні новага ўзору будзе ажыццяўляцца з 1 студзеня па 31 снежня, гэта значыць, на працягу ўсяго 2012 года», — паведаміў журналістам намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анатоль ЗАГОРСКІ.**

Анатоль Загорскі падкрэсліў, што льготы, прадугледжаныя Законам «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый» будуць прадастаўляцца на працягу года як па новым пасведчанні, так і па пасведчанні ранейшага ўзору. Усяго дакументы павінны абмяняць па краіне каля 1,5 мільёна чалавек, у тым ліку 114 тысяч удзельнікаў ліквідацыі катастрофы; 11,5 тысячы грамадзян, якія сталі інвалідамі ў выніку яе; 1 млн 100 тысяч чалавек, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях, і яшчэ 300 тысяч чалавек, якія пакінулі забруджаныя тэрыторыі. Улічваючы такую вялікую колькасць уладальнікаў пасведчанняў, пад абмен быў зарэзерваваны цэлы год.

— Неабходнасць абмену абумоўлена ў тым ліку і тым, што зараз грамадзяне Беларусі карыстаюцца пасведчаннямі, бланкі якіх былі надрукаваны яшчэ ў СССР, у пасведчаннях шмат выпраўленняў, якія ўскладняюць вызначэнне сапраўднасці такіх дакументаў, — дадаў Анатоль Загорскі. — Таксама вялікая колькасць пасведчанняў больш чым за дваццаць гадоў актыўнага выкарыстання паспела прыйсці ў непрыдатны стан. Аднак хачу падкрэсліць, што мы праводзім чыста тэхнічны абмен, не ўдакладняючы пры гэтым абгрунтаванасць выдачы пасведчанняў.

Абмену падлягаюць пасведчанні ўдзельнікаў ліквідацыі, выдадзеныя і перарэгістраваныя ў вызначаным парадку да 1 студзеня 2012 года, і пасведчанні пацярпелых, выдадзеныя ў вызначаным парадку да 1 студзеня 2012 года. **У выніку абмену ўсе грамадзяне (і пацярпелыя, і ліквідатары) атрымаюць пасведчанні адзінага ўзору — «Пасведчанне пацярпелага ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый», згодна з формай, зацверджанай Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.**

— Але ў кожнае пасведчанне будуць уносіцца персанальныя звесткі. У прыватнасці, пад дзеянне якога артыкула і якога пункта артыкула «чарнобыльскага закона» трапляе яго ўладальнік, — удакладніў спецыяліст. — Пасведчанне будзе заламініравана, каб менш падвяргацца знешняму ўздзеянню і каб у яго ўжо нельга было ўнесці нейкія праўкі.

Абмен пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі на новыя будзе ажыццяўляцца тымі дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі), якія праводзілі перарэгістрацыю пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі, або іх праваправапераемнікамі.

У выпадку, калі цяпер такі дзяржаўны орган (арганізацыя) не мае права праводзіць абмен пасведчанняў, грамадзяне павінны звяртацца ў аблвыканкамы і адміністрацыі раёнаў горада Мінска па месцы жыхарства.

Абмен пасведчанняў пацярпелых будзе ажыццяўляцца мясцовымі выканаўчымі органамі па месцы жыхарства грамадзян.

**Для правядзення абмену грамадзяне павінны падаць:**

*1. Заяву.*

*2. Арыгінал (дублікат) пасведчання ўдзельніка ліквідацыі або пасведчанне пацярпелага.*

*3. Два каляровыя фотаздымкі 30 на 40 мм.*

*4. У выпадку, калі грамадзянін з'яўляецца інвалідам у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, ён таксама павінен падаць копію пасведчання інваліда.*

Не будзе праводзіцца абмен пасведчанняў, якія прадастаўлялі права на льготы ў адпаведнасці з артыкуламі 22-25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 22 лютага 1991 года «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», калі ў іх не былі ўнесены змяненні з улікам норм дзейнага Закона Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2009 года «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый». Такія грамадзяне могуць да 31 снежня гэтага года звярнуцца ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, які выдаў пасведчанне пацярпелага, для ўнясення ў яго адпаведных змяненняў. З 1 студзеня 2012 года пасведчанні пацярпелых, у якія не былі ўнесены змяненні, будуць лічыцца несапраўднымі. Грамадзянін, чыё пасведчанне з 1 студзеня 2012 года будзе лічыцца несапраўдным, зможа звярнуцца ў выканаўчы камітэт па месцы жыхарства за наданнем яму статуса пацярпелага і выдачай новага пасведчання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЯК БУДУЦЬ КУРСІРАВАЦЬ ЭЛЕКТРЫЧКІ ПАДЧАС СВЯТ?

**Беларуская чыгунка вызначыла рэжым курсіравання прыгарадных цягнікоў у святочныя і перадсвяточныя дні ў снежні і студзені.**

Паводле інфармацыі Мінскага аддзялення, на ўчастках Мінск — Маладзечна, Мінск — Асіповічы, Мінск — Баранавічы, Мінск — Орша ён будзе наступным. 23 і 30 снежня, 6 студзеня — як па пятніцах, 24 і 31 снежня, 7 студзеня — па раскладзе суботы, 1 і 8 студзеня — нядзелі.

У вышэйназваныя дні з'явіцца шэраг дадатковых электрацягнікоў. Так, 23 і 30 снежня, 6 студзеня гэта будуць прыгарадныя цягнікі: Мінск — Аляхновічы (адпраўленнем у 15.53) і Аляхновічы — Мінск (адпраўленнем у 18.10); Мінск-Пасажырскі — Пухавічы (адпраўленнем у 16.52) і Пухавічы — Мінск-Пасажырскі (18.48). 24 і 31 снежня, 7 студзеня ў раскладзе з'явяцца дадатковыя электрацягнікі: Мінск — Аляхновічы (9.38) і Аляхновічы — Мінск (11.17); Мінск-Пасажырскі — Пухавічы (9.08) і Пухавічы — Мінск-Пасажыскі (12.00); Мінск-Інстытут культуры — Стоўбцы — 10.20) і Стоўбцы — Мінск-Інстытут культуры (12.47); Мінск-Інстытут культуры — Барысаў (10.20) і Барысаў — Мінск-Інстытут культуры (12.25).

1 і 8 студзеня да паслуг пасажыраў дадатковыя цягнікі: Мінск — Аляхновічы (адпраўленнем у 11.59) і Аляхновічы — Мінск (13.53); Мінск — Аляхновічы (15.53) і Аляхновічы — Мінск (18.10); Мінск-Пасажырскі — Талька (12.54) і Талька — Мінск-Пасажырскі (14.49); Мінск-Пасажырскі — Пухавічы (16.52) і Пухавічы — Мінск-Пасажырскі (18.48); Мінск-Інстытут культуры — Стоўбцы (10.20) і Стоўбцы — Мінск-Інстытут культуры (12.47); Мінск-Інстытут культуры — Стоўбцы (11.02) і Стоўбцы — Мінск-Пасажырскі (15.34); Мінск-Інстытут культуры — Барысаў (10.20) і Барысаў — Мінск-Інстытут культуры (адпраўленнем у 12.25).

У Маладзечанскім вузле і на ўчастку Орша — Лепель 23 і 30 снежня, 6 студзеня рух прыгарадных цягнікоў будзе арганізаваны як па рабочых днях, 24-25 і 31 снежня, 1, 7-8 студзеня — як па выхадных. Дадаткова будуць прызначаны дызель-цягнікі: 31 снежня — Орша — Чашнікі (адпраўленнем у 7.18) і Чашнікі — Орша (10.03); 1 студзеня — Орша — Лепель (адпраўленнем у 13.44) і Лепель — Орша (адпраўленнем у 17.58).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УСЁ ЖЫЦЦЁ ЗА КРАТАМІ

**Пажыццёвым зняволеннем пакараў Магілёўскі абласны суд забойцу сельскай сямейнай пары.**

Гэты прысуд аб'яўлены 14 снежня ў Чавусах. Гучнае забойства адбылося ў сёлетнім чэрвені ў вёсцы Галачова Чавускага раёна. Кампанія спажывала спіртныя напоі, а назаўтра раніцай цела гаспадара хаты знайшлі на прыступках, а ўнутры — нежывую жонку, на целе якой налічылі нямала нажавых раненняў.

Вінаватым у забойстве прызналі мужчыну, які піў разам з парай. П'яная спрэчка вылілася ў забойства. Прычым вінаваты гвалтоўна пазбавіў чалавека жыцця ўжо не ў першы раз. У 21 год ён забіў пенсіянерку і адсядзеў за кратамі 12 гадоў. Праз год пасля вызвалення зноў забіў жанчыну і правёў у турме 15 гадоў. Восем гадоў таму выйшаў на волю і зноў забіў... адразу дваіх. Таму трэцяя судзімасць — ужо пажыццёвая.

**Алена КАЗЛОВА.**

## АМАТАРЫ СВЕЖЫНЫ

**Трох трусоў выкраў з двара ў Доўску Рагачоўскага раёна непрацуючы грамадзянін, раней асуджаны за крадзеж.**

Ён не паспеў пазбавіць жывёл жыцця — пушыстыя звяркі канфіскаваны. Дарэмна меркаваў і жыхар Светлагорска, што яму сыдзе з рук крадзеж трох кароў дзяржаўнага прадпрыемства «Дварышчанскі» Жлобінскага раёна. Знойдзены таксама выкрадальнік двух парсючкоў з памяшкання свінагадоўчага комплексу «Зарэчча», што на Рагачоўшчыне. Ім, прынамсі, аказаўся работнік гэтага прадпрыемства. Куры «падвялі пад манастыр» жыхара пасёлка Рассветны Гомельскага раёна. 5 птушак, выкрадзеных з чужога падворка, загінулі заўчасна ад рукі раней судзімага зламысніка. Але яму цяпер не пазбегнуць адказнасці. Зноў сядзе на лаву падсудных і жанчына, якая ўкрала з прыватнага дома ў вёсцы Рагі Гомельскага раёна... свіную галаву.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## У Мінску — «АлкаБоль»

**Увесь бягучы тыдзень у сталіцы праходзіць акцыя «АлкаБоль» па прафілактыцы п'янства і алкагалізму.**

Паводле слоў начальніка міліцыі грамадскай бяспекі Першамайскага РУУС г. Мінска Андрэя МІНІЧА, асноўныя намаганні падчас акцыі скіраваны на ажыццяўленне некалькіх мерапрыемстваў. Найперш — прафілактыку правапарушэнняў сярод тых, хто стаіць на ўліку за ўчыненне сямейна-бытавых правапарушэнняў у стане алкагольнага ап'янення.

Акрамя гэтага, адбудуцца выязныя пасяджэнні судоў па разглядзе крымінальных спраў па злачынствах супраць жыцця і здароўя грамадзян. Хранічных алкаголікаў накіруюць у лячэбна-працоўныя прафілакторыі, а некага па прычыне злоўжывання алкаголем абмяжуюць у дзеяздольнасці ці нават пазбавяць бацькоўскіх правоў. Працягнецца і работа па спыненні незаконнага абарачэння спіртавой прадукцыі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Бабёр адкрыў памежнікам схованку кантрабандыстаў

**Бабёр раскрыў тайнік кантрабандыстаў, дзе была схавана буйная партыя тытунёвых вырабаў. Тайнік знаходзіўся за 15 метраў ад беларускай мяжы, паведамілі БЕЛТА ў прэс-цэнтры Дзяржпагранкамітэта.**

На рацэ Вілія невядомымі быў схаваны плыт з GPS-навігатарам, на якім знаходзілася 12 каробак цыгарэт з беларускімі акцызнымі маркамі. Промыслу кантрабандыстаў перашкодзіў бабёр. Ён зваліў дрэва, да якога быў прывязаны плот. Тавар канфіскаваны смаргонскімі памежнікамі. Цяпер праводзіцца работа па выкрыцці асоб, якія маюць дачыненне да супрацьпраўнай дзейнасці.

## Выпіска з рэспубліканскага спісу экстрэмісцкіх матэрыялаў

| Від інфармацыйнай прадукцыі | Назва, аўтар, вытворца інфармацыйнай прадукцыі | Назва суда, які вынес рашэнне, і дата ўваходжання ў сілу рашэння суда |
|---|---|---|
| Кніжнае выданне | «Особое мнение или обращение христианки», Алена Гнаук, Брэст, 2011 г. | Рашэнне суда Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці, ад 16.11.2011 г., якое ўвайшло ў сілу 29.11.2011 г. |

Кірмаш

## І РЫБКІ КУПІЦЬ, І ЮШКІ ПАСПЫТАЦЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**17 і 18 снежня ў Мінску каля Палаца спорту пройдзе рыбны кірмаш з удзелам рыбаводных гаспадарак і рыбаперапрацоўчых прадпрыемстваў з усёй краіны. Доўжыцца мерапрыемства будзе з 9 да 16 гадзін.**

Па цэнах вытворцаў пакупнікам прапануюць шырокі асартымент прадукцыі: жывую сажалкавую рыбу (карпа, таўсталобіка, белага амура, сома, шчупака, карася, асятра, сцерлядзь, фарэль і інш.), вэнджана-сушаную прадукцыю, мароженыя паўфабрыкаты, кансервы, а таксама марскую рыбу і рыбапрадукты з Балтыйскага мора. Па традыцыі наведнікаў рыбнага кірмашу чакаюць дэгустацыі, якія дазволяць ацаніць якасць прапанаванай прадукцыі. Кулінары рыбаводных гаспадарак абяцаюць парадаваць спажыўцоў юшкай і барбекю. Натуральна, падчас кірмашу будуць працаваць прадпрыемствы грамадскага харчавання, а настрой створаць калектывы мастацкай самадзейнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Вакол футбола

## БАТЭ АБВЯСЦІЎ НАБОР

**Чэмпіён Беларусі папоўніўся бразільскім форвардам Майконам Каліжуры і армянскім паўабаронцам Завенам Бадаянам.**

Як інфармуе афіцыйны сайт ФК БАТЭ, з польскага клуба «Ягелонія» (Беласток) падпісаны ў арэнду на паўгода бразільскі форвард Майкон Каліжуры з правам першачарговага выкупу. Майкон ужо знаёмы беларускім балельшчыкам і запомніўся высокай выніковасцю падчас выступленняў у «Гомелі», дзе ў сезонах 2008 і 2009 ён з'яўляўся партнёрам Рэнана Брэсана. Яшчэ адзін навабранец БАТЭ, паўабаронца Завен Бадаян выступаў за армянскі «Імпульс» з Дыліжана. Ён заключыў кантракт з БАТЭ тэрмінам на чатыры гады.

## ТОРЭС СА ЗНІЖКАЙ

**Нападаючы лонданскага «Чэлсі» і зборнай Іспаніі па футболе Фернанда Торэс можа пакінуць клуб.**

Торэс быў набыты ў «Ліверпуля» за рэкордныя для Англіі 50 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў па патрабаванні гаспадара каманды — расійскага мільярдэра Рамана Абрамовіча, але так і не прыжыўся ў асноўным складзе каманды. Зараз кіраўніцтва «Чэлсі» гатова прадаць самага дарагога футбаліста ў гісторыі прэм'ер-лігі любому клубу за 20 мільёнаў фунтаў. Нападаючы атрымлівае ў «Чэлсі» 150 тысяч фунтаў стэрлінгаў штотыдзень. З моманту прыходу ў лонданскую каманду — 31 студзеня 2011 года — Торэс забіў толькі тры мячы ў англійскай прэм'ер-лізе і два ў Лізе чэмпіёнаў. Як адзначае Eurosport, у матчы 15-га тура чэмпіянату Англіі паміж «Чэлсі» і «Манчэстэр Сіці» на лаўцы запасных гульню пачалі футбалісты, на набыццё якіх клубы ў сукупнасці выдаткавалі астранамічную суму — чвэрць мільярда еўра.

**Общество с дополнительной ответственностью «Нэкст Трейдинг Компани»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:**

| № лота | Наименование имущества | Место нахождения имущества | Собственник | Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС) | Задаток 5%, рублей (без учета НДС) |
|---|---|---|---|---|---|
| | ИМУЩЕСТВА (без учета НДС) | | | | |
| | Здание склада с инв. № 350/С-37661 общей площадью 1085,91 м², расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Базовая, 10 | г. Гомель, ул. Барыкина, 10 | ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» | | |
| 1 | Лот № 1 – Изолированное помещение № 3 общей площадью 72,6 кв.м, одноэтажное, материал стен – сборные железобетонные панели, кирпич, и асфальтовое покрытие площадью 107,0 м² | г. Гомель, ул. Базовая, 10-3 | ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» | 75 771 000 | 3 788 550 |
| 2 | Лот № 2 – Изолированное помещение № 5 общей площадью 73,2 кв.м, одноэтажное, материал стен – сборные железобетонные панели, кирпич, и асфальтовое покрытие площадью 108,0 м² | г. Гомель, ул. Базовая, 10-5 | ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» | 76 399 200 | 3 819 960 |
| 3 | Лот № 3 – Изолированное помещение № 7 общей площадью 148,4 кв.м, одноэтажное, материал стен – сборные железобетонные панели, кирпич, и асфальтовое покрытие площадью 220,0 м² | г. Гомель, ул. Базовая, 10-7 | ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» | 154 904 400 | 7 745 220 |
| 4 | Лот № 4 – Изолированное помещение № 8 общей площадью 288,2 кв.м, одноэтажное, материал стен – сборные железобетонные панели, кирпич, и асфальтовое покрытие площадью 426,0 м², ограждение железобетонное 60 м², металлические ворота с калиткой площадью 67,5 м². | г. Гомель, ул. Базовая, 10-8 | ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» | 307 992 600 | 15 399 630 |
| 5 | Лот № 5 – Здание бани с инв. № 350/С-48199 общей площадью 124 кв.м, одноэтажное кирпичное здание, крыша рулонная и асфальтовое покрытие площадью 183,5 м² | г. Гомель, ул. Барыкина, 309/Б | ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» | 148 449 000 | 7 422 450 |
| | Здание магазина с инвентарным номером 350/С-4278, одноэтажное облицованное кирпичом общей площадью 566, 0 кв.м и навес | г. Гомель, ул. Владимирова, 16 | ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» | | |
| 6 | Лот № 6 – Изолированное помещение № 1 (магазина) общей площадью 327,5 кв.м и навес | г. Гомель, ул. Владимирова, 16 | ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» | 1 616 968 000 | 80 848 400 |
| 7 | Лот № 7 – Изолированное помещение № 1 (магазина) общей площадью 236,9 кв.м | г. Гомель, ул. Владимирова, 16 | ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» | 1 159 108 000 | 57 955 400 |

Организатор торгов – управляющий в деле о банкротстве ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» Будков Д.В.

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

Задаток перечисляется **до 16.01.2012 г. (включительно)** на р/с № 3012130990006 – текущий в белорусских рублях в ОАО «Белвнешэкономбанк» Гомельское региональное отд. г. Гомель, МФО 151501213, УНП 490499237.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течении 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа доли этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления до **16.00. 16.01.2012 года** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Дата, время, место проведения открытого аукциона **17.01.2012 года в 14.00**, г. Гомель, ул. Молодости, 5.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 655 33 68; 621 22 36 или (8029) 621 22 36, www.disponent.by**

**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
А.Л. Гальперин
15.12.2011 года

**УТВЕРЖДЕНО**
Общим собранием Участников
КСО «Внешэкономстрой» ООО
«01» декабря 2011 года
(протокол № 70)

**КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ**
**об открытой продаже жилищных облигаций тридцать пятого выпуска Коммерческой совместной организации «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (КСО «Внешэкономстрой» ООО)**

**Раздел 1. Общие сведения об эмитенте**

**1. Наименование эмитента.**

На белорусском языке:

полное наименование: Камерцыйная сумесная арганізацыя «Знешэканомбуд» таварыства з абмежаванай адказнасцю;

сокращенное наименование: КСА «Знешэканомбуд» ТАА.

На русском языке:

полное наименование: Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью (далее по тексту – эмитент);

сокращенное наименование: КСО «Внешэкономстрой» ООО.

**2. Место нахождения эмитента:** 220004, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А; **телефон**: (017) 218 15 56; **факс**: (017) 218 15 55; **электронный адрес** (e-mail): market@vnesheconomstroy.by.

**3. Основной вид деятельности эмитента:**

согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006

701 – Операции с собственным недвижимым имуществом.

Эмитент вправе осуществлять функции заказчика (застройщика) согласно «Инструкции о застройщике, заказчике в строительстве», утвержденной приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь 22 июня 1999 г. № 174 (с учетом изменений в действующей редакции).

**4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка:** р/с № 3012004529008 в ОАО «Белвнешэкономбанк», г. Минск, ул. Мясникова, 32, код 226.

**5. Бухгалтерская отчетность** эмитента в составе, определенном пунктом 8 Инструкции о порядке представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации, утвержденной постановлением Министерством финансов Республики Беларусь от 21.12.2010 г. № 157 «О некоторых вопросах представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации», в соответствии с законодательством в периодическом печатном издании не публиковалась и ее опубликование не требуется.

**6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**: Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк» (далее по тексту – депозитарий).

Место нахождения депозитария: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, ком. 607. Зарегистрирован Национальным Банком Республики Беларусь 12 декабря 1991 года, регистрационный номер 24.

Специальное разрешение (лицензия) № 02200/5200-124-918 выдано Министерством финансов Республики Беларусь 29 июля 2002 г. Срок действия специального разрешения (лицензии) продлен на основании решения № 243 от 13 июля 2007 г.

**7. Размер уставного фонда эмитента:** 1 197 275 (Один миллион сто девяносто семь тысяч двести семьдесят пять) долларов США (уставный фонд сформирован в размере 100 %).

**8. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование органа, его зарегистрировавшего.**

Коммерческая совместная организация «Внешэкономстрой» общество с ограниченной ответственностью зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь 15 августа 2002 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800015707.

**9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.**

Ознакомиться с Проспектом эмиссии облигаций можно ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 15.00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9.00 до 12.30) начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:

- в КСО «Внешэкономстрой» ООО по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 23, к. 3, оф. 208А;
- в ОАО «Белвнешэкономбанк» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

**10. Решение о выпуске жилищных облигаций тридцать пятого выпуска** принято 09.11.2011 года на внеочередном Общем собрании Участников (**протокол № 66**).

**11. Объем эмиссии жилищных облигаций составляет:**

**тридцать пятого** выпуска – 3 475 650 000 (Три миллиарда четыреста семьдесят пять миллионов шестьсот пятьдесят тысяч) белорусских рублей;

**Количество** жилищных облигаций:

**тридцать пятого** выпуска – 170 (Сто семьдесят) штук;

**12. Номинальная стоимость одной жилищной облигации:**

**тридцать пятого** выпуска – 20 445 000 (Двадцать миллионов четыреста сорок пять тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартира 7-ой категории в «Многофункциональном комплексе» по проспекту Победителей, 27 в г. Минске).

**13. Открытая продажа (размещение)** жилищных облигаций проводится **с 16 декабря 2011 года по 23 марта 2012 года**.

**14. Срок обращения облигаций с 16 декабря 2011 года по 31 марта 2012 года включительно (106 календарных дней).**

**15. Проведение открытой продажи (размещения)** жилищных облигаций осуществляется ОАО «Белвнешэкономбанк» ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 15.00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленным нерабочими, с 9.00 до 12.30) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

**16. Облигации зарегистрированы** Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 15 декабря 2011 года.

Регистрационный номер: № 5-200-02-1308.

**Директор КСО «Внешэкономстрой» ООО** В.В.Ермошин

**Главный бухгалтер** С.М.Анардович

«Прамая лінія» газеты «Звязда» і радыёстанцыі «Мір»

# «УВАЙСЦІ» І «ВЫЙСЦІ» З НАВАГОДНЯГА СВЯТА

**СУМЕСНА з радыёстанцыяй «Мір» наша газета правяла «прамую лінію» па тэме падрыхтоўкі да калядна-навагодніх свят. Каб сапраўды адчуць і прыемна перажыць свята, дый любы адпачынак у прынцыпе, неабходны, як высвятляецца, не толькі фінансавыя траты, але і адпаведны эмацыянальны настрой. Што ж, будзем настройвацца. З дапамогай урача-псіхатэрапеўта 1-й кваліфікацыйнай катэгорыі Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў Аксаны БЯЛАН, якая адказала на пытанні не толькі карэспандэнтаў радыёстанцыі «Мір» і газеты «Звязда», але таксама і на пытанні слухачоў і чытачоў.**

*(Працяг. Пачатак у нумары за 15 снежня.)*

**«Звязда»: Можа, варта яшчэ даверыцца экстрасэнсам, варажбе?**

— Асабіста я лічу гэта сто першым спосабам аднімання грошай у сумленных грамадзян.

**«Звязда»: Новы год — сямейнае свята ці зусім наадварот?**

— Тут не трэба блытаць такія розныя па сваёй сутнасці святы, як Каляды і Новы год. Раство як у каталіцызме, так і ў праваслаўі — свята сапраўды больш сямейнае. Сям'я ідзе разам у храм, збіраецца за агульным сталом, адбываецца поўнае яднанне блізкіх людзей. А Новы год — мерапрыемства больш свецкае, і праводзіць яго можна як заўгодна.

**«Звязда»: Як правільна выйсці са свята?**

— Існуе паняцце адаптацыі да любых новых умоў — мы адаптуемся нават да кароткіх выхадных, часам крыху больш працяглых свят і да больш працяглага адпачынку. Чым больш працяглыя нашы «канікулы», тым для нас лепш, паколькі лічыцца, што для адаптацыі розным людзям патрабуецца ў сярэднім 4-7 дзён. Таму браць адпачынак на 10 дзён абсалютна немэтазгодна — мінімум на 15-20... Калі святы зацягнуліся, то гэта запатрабуе пэўнага часу для выхаду. Мы павольна ўваходзім у расслабленне і, адпаведна, павольна павінны мабілізавацца для працы, што звычайна займае 2-4 дні. Штотыдзень наша поўная працаздольнасць аднаўляецца да серады. Гэта пік нашай працаздольнасці.

Безумоўна, трэба рыхтавацца да адпачынку. Важна пакінуць справы ў спакоі. Тым больш гэта важна сёлета, калі святы ў нас будуць «кароткімі». Трэба загадзя сказаць «стоп» працы і адвядзеныя пару дзён сапраўды адпачыць, атрымаць ад гэтага задавальненне. Калі мы хоць бы ў думках пацягнем з сабой работу, свята для нас не атрымаецца.

**«Звязда»: Малая колькасць выхадных дзён наогул не сапсуе нам адчуванне свята?**

— Не сапсуе. Свята можа атрымацца ў любым выпадку. Няхай яно будзе па скарочанай праграме, але ў нашых сілах надаць яму належнае значэнне.

**«Звязда»: Як вызначыць памежны псіхалагічны стан?**

— Калі ёсць адчуванне, што больш як на тыдзень мы выбіліся са свайго звыклага рытму ў горшы бок, пачалі выкарыстоўваць нейкія даступныя нам спосабы, каб вярнуцца «ў каляіну», аднак не адчуваем ні належных сіл, ні, па вялікім рахунку, жадання займацца гэтым, значыць, трэба ісці да псіхатэрапеўта. Псіхатэрапеўтычнае лячэнне будзе накіравана на тое, каб разам са спецыялістам спрабаваць памяняць свае перакананні, погляды, уяўленні, спосабы рэагавання, паводзіны... Трэба падкрэсліць, што ламаць сябе не давядзецца. Мы нічога і нікога не ламаем, а толькі абапіраемся на тое добрае, што ёсць, і надбудоўваем тое, чаго нестае. Многае залежыць ад асаблівасцяў асобы, хуткасці мыслення... Калі чалавек ведае, што ён з вялікай цяжкасцю ідзе на нешта новае, то яму цяжка будзе перабудавацца. Псіхатэрапеўтычная работа магчымая ў любым выпадку, але ў гэтым выпадку зойме крыху больш часу.

**«Звязда»: Якія саматычныя захворванні паказваюць на тое, што паралельна трэба было б наведаць і ўрача-псіхатэрапеўта?**

— Вылучана сем захворванняў, якія называюцца псіхасаматычнымі, паколькі ў іх развіцці вялікую ролю іграе эмацыйны стан. Гэта артэрыяльная гіпертэнзія, язвавая хвароба страўніка і 12-перснай кішкі, неспецыфічны язвавы каліт, нейрадэрміт, экзэма, псарыяз, рэўматоідны артрыт, бранхіяльная астма. Гэта хваробы, пры лячэнні якіх патрабуецца як лячэнне непасрэдна іх саміх, так і лячэнне псіхатэрапеўтычнага кшталту.

Існуюць яшчэ і саматаформныя расстройствы, калі ў чалавека з'яўляюцца нейкія дыскамфортныя адчуванні накшталт успушвання жывата, адрыжка, галаўныя боль, непрыемныя сімптомы ў жываце, сверб, напружанне. З гэтымі непрыемнасцямі пацыент звяртаецца да тэрапеўта, неўролага ці гастраэнтэролага, аднак у яго не знаходзяць ніякай паталогіі. Гэта дакладна наш пацыент.

**«Звязда»: Як можна трапіць на прыём да ўрача-псіхатэрапеўта?**

— Па нумары рэгістратуры нашага цэнтра — 245 61 74 можна як запісацца на прыём да такога спецыяліста, так і даведацца аб тым, у якіх паліклініках ёсць псіхатэрапеўты. Сёння яны ёсць амаль у кожнай паліклінічнай установе. У наш цэнтр могуць накіраваць і іншыя спецыялісты паліклінік. Візіт будзе бясплатным, хоць у нас ёсць і платныя паслугі. Дарэчы, трэба мець на ўвазе і магчымасць частых візітаў да спецыяліста, а таму варта прадугледзець, каб гэта было зручна.

У іншых гарадах кабінеты псіхатэрапіі працуюць на базе гарадскіх псіханеўралагічных дыспансэраў. Калі ж недзе няма псіхатэрапеўта, можна звярнуцца і да псіхіятра. Прынцыповая розніца паміж гэтымі спецыялістамі заключаецца ў тым, што апошні займаецца пераважна тымі расстройствамі, якія маюць патрэбу ў медыкаментозным лячэнні, а ўласна псіхатэрапеўтычнае лячэнне ажыццяўляе, зразумела, псіхатэрапеўт. На базе нашага цэнтра і вышэйзгаданых дыспансэраў працуюць і клінічныя псіхолагі, якія выдатна адрозніваюць норму ад паталогіі і дакладна ўсведамляюць, дзе яшчэ яны здольны дапамагчы, а ў якіх выпадках неабходна накіроўваць да псіхатэрапеўта. Задача псіхолагаў — выяўленне з дапамогай тэсціравання цяжкасці, глыбіні расстройства, ступені функцыянавання галаўнога мозга, а таксама пэўная псіхакарэкцыя. Існуюць спецыяльныя тэхнікі, якія можа праводзіць толькі псіхатэрапеўт. Задача ж псіхолага, напрыклад, у школе — дапамагчы адаптавацца да ўмоў, а не вылечыць ад расстройства. Да псіхолага можа накіраваць любы спецыяліст, а псіхолаг можа накіраваць да псіхатэрапеўта.

**— Мінск, Алена. Я вось гляджу на цэннікі ў краме і думаю: можа, наогул адмовіцца ад святкавання Новага года? Скажам, не накрываць на стол, не траціцца на падарункі, усялякую мішуру і г.д., а проста паглядзець тэлевізар і легчы спаць. Ці, нягледзячы на ўсялякія крызісы, не варта адмаўляцца ад свята?**

— Нам ніхто не забараняе проста паглядзець тэлевізар і легчы спаць. Аднак у горадзе праводзіцца ў гэты час дастаткова масавых мерапрыемстваў. Можна выйсці на вуліцу, калі дазваляе здароўе... Гэта ж не патрабуе ніякіх выдаткаў. Можна не накрываць стол на дваццаць страў. Дастаткова купіць некалькі відаў сыру, прыгожа нарэзаць і расКласці на прыгожым посудзе...

**— Бабруйск, Раіса. Сястра месяц таму пахавала мужа. Знаходзіцца зараз у вельмі прыгнечаным стане. Гэтаму, напэўна, спрыяе і адзінота — яна на пенсіі, сын жыве ў Магілёве. Можа, ёй неабходна папіць які-небудзь прэпарат?**

— Вашай сястры неабходна звярнуцца па месцы жыхарства да ўрача-псіхатэрапеўта, які, вядома, ёсць у паліклініках Бабруйска. З улікам таго, што мае быць прыгнечаны стан, думаю, не абысціся без медыкаментознай тэрапіі, а яе павінен падабраць толькі спецыяліст. Хутчэй за ўсё, гэта бузе досыць працяглы курс, паколькі рэакцыя гора пасля страты блізкага чалавека у норме доўжыцца не менш за 6 месяцаў. Таму лячыць менш за гэты тэрмін наогул немэтазгодна — можа быць паўторнае пагаршэнне стану. І наогул трэба мець на ўвазе, што нават за паўгода выздараўленне надыходзіць не заўсёды. Чакаць жа, што стан пройдзе сам сабой, можна, аднак калі гэты стан перашкаджае нармальнаму жыццю, зніжае, кажучы прафесійнай мовай, функцыянаванне, чалавек перастае атрымліваць задавальненне ад жыцця, то які сэнс трываць?

**— Мінск, Ірына Яўгенаўна. Як вы ставіцеся да гамеапатыі? Урач падабрала мне гамеапатычнае лячэнне па прычыне майго моцнага перанапружання, у выніку якога з'явіліся моцныя болі ў сэрцы...**

— Я хацела б зрабіць акцэнт на такім момантце. Калі вы аднойчы звярнуліся да ўрача, той прызначыў вам лячэнне і падчас гэтага лячэння ў вас з'яўляюцца нейкія непрыемныя адчуванні, значыць, вельмі важна пайсці менавіта да гэтага ўрача зноў. Па-першае, у выпадку з гамеапатыяй толькі ўрач з адпаведнай адукацыяй валодае поўнай інфармацыяй аб гэтых прэпаратах. Спецыяліст павінен прааналізаваць, ці магчыма з'яўленне нейкіх новых сімптомаў на фоне прыёму менавіта гамеапатычнага лячэння. Важна праканТраляваць і тое, каб перамагчы прычыну вашага перанапружання. Калі праблема так і застанецца нявырашанай, напружанне зменіць боль, знікне боль — з'явіцца сверб, знікне сверб — з'явіцца новая балячка. Наогул ёсць вялікая група такіх расстройстваў — яны называюцца саматаформнымі, за якімі хаваюцца непрыемныя эмоцыі накшталт страху, крыўды, перанапружання. Адсюль, можа быць, і вашы болі ў сэрцы... Вельмі часта сімптомы мяняюцца на працягу расстройства. Гэта сведчыць пра тое, што лячэнне незавершанае. Выздараўленне не наступіла. Выкарыстанне гамеапатыі можа мець месца. Проста кожнаму ўзроўню расстройства павінна адпавядаць сваё лячэнне. На пачатку гэта можа быць і гамеапатыя, аднак калі мы бачым, што праз тры-чатыры тыдні няма ніякага эфекту, значыць, ёсць патрэба ў больш моцных прэпаратах.

**— А як можна трапіць на прыём у ваш цэнтр?**

— Пазваніць па нумары рэгістратуры: 245 61 74 і запісацца на прыём. Наогул вам падкажуць, дзе па месцы жыхарства можна атрымаць псіхатэрапеўтычную дапамогу, або накіруюць у наш цэнтр. Першасны прыём у нас доўжыцца 45 хвілін. Уся інфармацыя застанецца, безумоўна, у кабінеце... Калі ласка, давярайце сабе. Разлічвайце на свае сілы, паколькі ў любога чалавека досыць вялікія рэзервы для самадапамогі. Аднак калі адчуваеце, што ўсё ж такі не можаце вырашыць праблему, звяртайцеся па дапамогу.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*(Працяг будзе.)*

Беларусы замежжа

## Жанна РАМАНОЎСКАЯ:

# «ТАК ХОЧАЦЦА ПАГАВАРЫЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ»



Фота Віктара ДАШКЕВІЧА.

**З Жаннай Рамаioўскай, якая жыве ў Даўгаўпілсе — другім па велічыні горадзе суседняй Латвіі, — выпадкова пазнаёміўся ў Віцебскім гарвыканкаме, дзе яна ўдзельнічала ў падпісанні пагаднення аб супрацоўніцтве ў галіне інфармацыйнага абмену.**

Жанна ўзначальвае, бадай, самы папулярны інфармацыйны партал рэгіёна Латгалія.

— Наш партал асвятляе падзеі ў Латгаліі, дзе больш за 320 тысяч чалавек насельніцтва, — расказвае **Жанна Раманоўская, кіраўнік партала навін D-fakti.lv.** — Таксама на партале размяшчаем інтэрв'ю з кіраўнікамі ўлад гарадоў, структур самакіравання, буйных прадпрыемстваў, а таксама з артыстамі, якія прыязджаюць на гастролі. Вельмі запатрабаваныя таксама гутаркі з цікавымі людзьмі. Ёсць магчымасць у нашых чытачоў «напрамую» праз партал задаць пытанні і мэру Даўгаўпілса. Цесна і плённа супрацоўнічаем з гарадской думай. У прыватнасці, на партале размяшчаем тэлевізійны «прадукт», які вырабляюць супрацоўнікі прэс-службы думы.

Як расказала спадарыня Раманоўская, партал незалежны ад палітычных сіл, таму журналісты могуць быць адносна незалежнымі ў падачы навін. Партал зарабляе сабе грошы самастойна. З віцебскімі калегамі, якія таксама робяць даволі папулярны партал, але пры гэтым атрымліваюць падтрымку з боку гарвыканкама, будзе весціся цеснае супрацоўніцтва.

— Адпраўной кропкай для наладжвання супрацоўніцтва, можна сказаць, стаў віцебскі інвестыцыйны форум, які сёлета прайшоў у вашым прыгожым горадзе, — расказвае Жанна Раманоўская. — Мы пазнаёміліся з прадстаўнікамі гарвыканкама і вырашылі аб'яднаць дзве інфармацыйныя прасторы — Латвіі і Беларусі (у прыватнасці, Латгаліі і Віцебскай вобласці). Мы — суседзі, прычым нас яднае і рака — Заходняя Дзвіна (Даўгава). Таму жыхарам Латвіі цікава, як жывуць беларусы. У Віцебскай вобласці ёсць шмат таго, пра што трэба расказваць. У прыватнасці, у Віцебску ажыццяўляецца такі інфармацыйны праект, як «Мабільны горад», які вельмі карысны для развіцця турызму, спрыяе экспарту тавараў беларускай вытворчасці. Наогул мы хочам, каб прадпрымальнікі як Латгаліі, так і Прыдзвінскага краю атрымлівалі як мага больш інфармацыі па вядзенні бізнэсу, па інвестыцыях. Звычайным спажыўцам вельмі цікава прачытаць пра магчымасці турыстычных паездак. Пра тое, што можна ўбачыць на свае вочы ў Віцебску і вобласці ў цэлым. Таксама шмат цікавага ёсць для турыстаў у Латгаліі.

Спадарыня Раманоўская расказала, што партал, якім яна кіруе, супрацоўнічае і з літоўскімі партнёрамі — з тэлекампаніяй і газетай горада Вісагінаса. Адпаведна, навіны пра Віцебск і Беларусь змогуць прачытаць і ў Літве. Ды і наогул дзякуючы інтэрнэту з'явіцца дадатковая магчымасць «рэкламаваць» турыстычныя і эканамічныя магчымасці Прыдзвінскага краю ва ўсім свеце.

**— Вы сказалі, што навіны на партале размяшчаюцца на рускай і латышскай мове. А ці няма планаў выстаўляць іх на сайт і на беларускай?**

— У Латгаліі жывуць шмат беларусаў — калі не памыляюся, 13 працэнтаў ад колькасці ўсіх жыхароў. Для таго, каб адкрыць беларускую версію партала, спатрэбіцца шмат грошай. Штодня мы размяшчаем да шасці дзясяткаў «матэрыялаў» на дзвюх мовах. Таму наўрад ці недзяржаўны партал у бліжэйшай перспектыве зможа «пацягнуць» беларускую версію. Пры гэтым я разумею «падтэкст» вашага пытання. У горадзе, дзе жыве так многа беларусаў, няма беларускамоўнай школы, няма беларускай газеты. Можа, з іх трэба было б пачынаць? Пры гэтым у Даўгаўпілсе ёсць цэнтр беларускай культуры, дзейнасць якога фінансуе гарадская дума. Такі вось «ачаг» беларускай культуры, да якога «прымыкаюць» грамадскія арганізацыі — нацыянальныя культурныя таварыствы. І музей беларускай культуры ёсць, і невялічкі самадзейны тэатр. Нядаўна адбылася прэм'ера спектакля «Паўлінка». Беларусь — мая радзіма, таму і па-беларуску я чытаю з задавальненнем, хаця ў свой час скончыла рускую школу. На жаль, вельмі рэдка прыходзіцца гаварыць на роднай беларускай мове. Таму заўсёды прыемна, калі да мяне звяртаюцца па-беларуску. Думаю, калі б мела магчымасць пастаянна размаўляць на роднай мове, даволі хутка змагла б гаварыць без «акцэнту».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**26 декабря 2011 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой»**

**Повестка дня:**

1. О внесении и утверждении изменений и дополнений в устав Общества.

2. О совершении сделок Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Базановой, 19.

Начало регистрации участников собрания: 10.30.

*УНП 200050191*

В объявлении о проведении аукциона по продаже имущества, обращенного в доход государства, а именно: здание корпуса №9 и №9А в блоке с механозаготовительной и бытовой, общей площадью 7887,7 кв.м. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67 (газета «Звязда» №237 от 13.12.2011 г.) дату, время и место проведения аукциона следует читать: 13.01.2012 г. в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис».

Конечный срок и адрес приема заявок следует читать: 12.01.2012 г., до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», **тел. (8-0176) 73-00-13, факс 75-19-20, 8-044 710-74-60.**

*УНП 600182305*

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
❖ Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА САНТЭП**

| № лота | Наименование объекта |
|---|---|
| 1 | Холодильник «Смоленск», инв. № 421829 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 2 | Холодильник «Апшерон», инв. № 421044 – **171 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 3 | Холодильник «Смоленск», инв. № 421798 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 4 | Холодильник «Саратов», инв. № 421809 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 5 | Холодильник «Снежинка», инв. № 7891 – **276 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 6 | Холодильник «Морозко-3М», инв. № 7892 – **128 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 7 | Холодильник «Саратов», инв. № 421985 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 8 | Холодильник «Саратов», инв. № 500364 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 9 | Холодильник «Смоленск», инв. № 500368 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 10 | Холодильник «Саратов», инв. № 500120 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 11 | Холодильник «Саратов», инв. № 500115 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 12 | Холодильник «Саратов», инв. № 500119 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 13 | Холодильник «Саратов», инв. № 500118 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 14 | Холодильник «Арагац», инв. № 500121 – **107 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 15 | Холодильник «Саратов», инв. № 500116 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 16 | Холодильник «Саратов», инв. № 500117 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 17 | Холодильник «Саратов», инв. № 500108 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 18 | Холодильник «Саратов», инв. № 500113 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 19 | Холодильник «Саратов», инв. № 500114 – **364 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 20 | Холодильник «Смоленск», инв. № 500367 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 21 | Холодильник «Смоленск», инв. № 500365 – **354 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 22 | Стол однотумбовый, инв. №7809 – **88 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 24 | Стол двухтумбовый, инв. № 7816 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 25 | Стол однотумбовый, инв. № 7607 – **88 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 26 | Стол письменный, инв. № 7815 – **69 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 27 | Стол двухтумбовый, инв. № 7851 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 28 | Шкаф книжный, инв. № 7822 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 29 | Шкаф книжный, инв. № 7831 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 30 | Шкаф книжный, инв. № 7848 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 31 | Шкаф книжный, инв. № 7849 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 32 | Шкаф для одежды, инв. № 7846 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 33 | Шкаф для одежды, инв. № 7845 – **194 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 34 | Шкаф для одежды, инв. № 7829 – **194 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 35 | Шкаф для одежды, инв. № 7847 – **194 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 36 | Шкаф книжный, инв. № 7826 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 37 | Шкаф книжный, инв. № 7841 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 38 | Стол однотумбовый, инв. № 7833 – **88 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 39 | Стол двухтумбовый, инв. № 7823 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 40 | Стол однотумбовый, инв. № 7824 – **59 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 41 | Шкаф книжный, инв. № 7810 – **336 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 42 | Шкаф двухстворчатый, инв. № 7870 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 43 | Стол двухтумбовый, инв. № 500306 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 44 | Шкаф книжный, инв. № 500307 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 45 | Шкаф одежный, инв. № 500308 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 46 | Стол письменный, инв. № 500309 – **69 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 47 | Стол двухтуровый, инв. № 500310 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 48 | Стол двухтумбовый, инв. № 500311 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 49 | Стол двухтумбовый, инв. № 500312 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 50 | Стол двухтумбовый, инв. № 500313 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 51 | Стол двухтумбовый, инв. № 500315 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 52 | Стол двухтумбовый, инв. № 500316 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 53 | Шкаф книжный, инв. № 500323 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 54 | Шкаф одежный, инв. № 500324 – **159 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 55 | Шкаф книжный, инв. № 500325 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 56 | Шкаф книжный, инв. № 500326 – **254 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 57 | Стол двухтумбовый, инв. № 500327 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 58 | Стол двухтумбовый, инв. № 500328 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 59 | Стол двухтумбовый, инв. № 500329 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 60 | Стол двухтумбовый, инв. № 500332 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 61 | Стол двухтумбовый, инв. № 500333 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 62 | Стол двухтумбовый, инв. № 500334 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 63 | Стол двухтумбовый, инв, № 500335 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 64 | Стол двухтумбовый, инв. № 500336 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 65 | Шкаф двухстворчатый, инв. № 500337 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 66 | Шкаф двухстворчатый, инв. № 500338 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 67 | Шкаф двухстворчатый с антресолью, инв. № 7862 – **200 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 68 | Шкаф двухстворчатый с антресолью, инв. № 7863 – **200 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 69 | Шкаф трехстворчатый с антресолью, инв. № 7864 – **368 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 70 | Шкаф трехстворчатый с антресолью, инв. № 7865 – **368 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 71 | Стол под компьютер, инв. № 7882 – **155 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 72 | Стол под компьютер, инв. № 7883 – **103 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 73 | Стол под компьютер, инв. № 7884 – **155 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 74 | Стол под компьютер, инв. № 7885 – **103 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 75 | Шкаф одежный, инв. № 7890 – **200 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 76 | Стол двухтумбовый, инв. № 7893 – **295 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 77 | Стол двухтумбовый, инв. № 7894 – **197 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 78 | Шкаф для одежды, инв. № 7897 – **106 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 79 | Шкаф двухстворчатый с антресолью, инв. № 7909 – **133 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 80 | Мягкая мебель «Рось», инв. № 7905 – **500 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 81 | Телевизор «Горизонт 655-4», инв. № 7895 – **452 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 82 | Телевизор «Г 54 ТЦ 418», инв. № 7887 – **388 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 83 | Холодильник «Смоленск», инв. № 421826 – **202 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 84 | Выставочная конструкция, инв. № 422051 – **22 902 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 85 | Стол офисный красный, инв. № 422077 – **2 115 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 86 | Факс «Panasonic KX-FT 908», инв. № 421940 – **1 134 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 87 | Радиотелефон «Panasonic KX-A 143», инв. № 421995 – **195 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 88 | Холодильник «Минск-367», инв. № 421996 – **577 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 89 | Телефакс «Panasonic KX-FT 22», инв. № 422056 – **843 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 90 | ПО. Телефакс «Panasonic KX-FT 64», инв. № 422057 – **1 022 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 91 | Телефакс «BROTHER FAX 236», инв. № 422058 – **825 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 92 | Факс «Samsung sf-2S00», инв. № 44295 – **375 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 93 | Ксерокс многофункциональное устройство «SHARP AR-5316», инв. № 44345 – **1 800 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 94 | Палатка торговая, инв. № 7931 – **2 164 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 95 | Набор мебели «Ямполь», инв. № 7925 – **5 925 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 96 | Набор мебели «Дублин», инв. № 7928 – **533 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| 97 | Ковер 2,5х5,45, инв. № 7927 – **116 000** белорусских рублей (без учета НДС) |
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 19 января 2012 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **20 января 2012 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Номер р/с для перечисления залога** | р/с 3012105618108 в РД № 700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, задаток – 5%. |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс).**

**ТЕХНОБАНК**

Открытое акционерное общество
**220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44**

**Уважаемые акционеры ОАО «Технобанк»!**

Настоящим уведомляем о принятии внеочередным Общим Собранием акционеров ОАО «Технобанк», проведенным в очной форме 09.12.2011 (протокол № 4), решения о внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Технобанк» путем утверждения его в новой редакции и о Вашем праве требовать выкупа акций при условии, что Вы голосовали против принятия решения о внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Технобанк» путем утверждения его в новой редакции или не участвовали в Общем Собрании акционеров ОАО «Технобанк» от 09.12.2011, на котором было принято данное решение.

Для реализации своего права требовать выкупа акций Вам необходимо представить в письменном виде в ОАО «Технобанк» по адресу: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44 соответствующее заявление произвольной формы на имя Председателя Правления ОАО «Технобанк» в течение 30 дней со дня проведения Общего Собрания акционеров, на котором было принято решение, повлекшее возникновение права требовать выкупа акций (09.12.2011).

ОАО «Технобанк» по результатам рассмотрения поданных заявлений с требованиями о выкупе акций в течение 30 дней с даты поступления заявления сообщает акционерам об отказе в удовлетворении требований акционеров, либо в течение 70 дней удовлетворяет требования акционеров.

**Для получения дополнительной информации предлагаем обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80.**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010, УНП 100706562.

**Утерянный бланк строгой отчетности** «Зеленая Карта» серии BY/01/ в количестве 1 штуки № 5544665 представительства Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным**.

УНН 600013344

**ОАО «Дорожно-строительный трест № 3»**
**СООБЩАЕТ, ЧТО ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ, НАМЕЧЕННОЕ на 22 декабря 2011 года, СОСТОИТСЯ 28 декабря 2011 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «ДСТ № 3»;
2. О дополнительном выпуске акций ОАО «ДСТ № 3».
3. О внесении изменений в Устав ОАО «ДСТ № 3».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 28.12.2011 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 01.12.2011 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. № 33 и № 40.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с «Инструкцией о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями», утвержденной постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30.08.2006 г. № 1093).

Справки по телефонам: 28 40 20 — отдел правовой и кадровой работы, 23 64 24 — отдел экономического анализа и прогнозирования, 23 64 87 — Наблюдательный совет.

УНП 700049607

**Суд Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці** просіць грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра фактычнае месца знаходжання **Багуцкай Наталлі Міхайлаўны**, 03.03.1980 года нараджэння, ураджэнкі г. Рудня Смаленскай вобл. Расійскай Федэрацыі, апошняе вядомае месца жыхарства: в. Заольша Лёзненскага раёна, зарэгістраванай у в. Паддуб'е, вул. Цэнтральная, д. 8 Лёзненскага раёна, на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі аб'явы паведаміць іх суду на адрас: 211220, Віцебская вобласць, г.п. Лёзна, вул. Леніна, д. 100-а.

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
❖ Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА САНТЭП**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Эстакада крановая металлическая, инв. № 25 | 27 383 000 | 1 369 150 | 11 | Распределительное устройство, инв. № 500018 | 1 825 000 | 91 250 |
| 2 | Трансформаторная подстанция КТП-2 1000/10/0,4, инв. № 4151 | 65 354 000 | 3 267 700 | 12 | Распределительное устройство, инв. № 500019 | 1 825 000 | 91 250 |
| 3 | Трансформаторная подстанция КТП-2 1000/10/0,5, инв. № 4153 | 65 354 000 | 3 267 700 | 13 | Распределительное устройство, инв. № 500020 | 1 825 000 | 91 250 |
| 4 | Трансформаторная подстанция КТП-2 1000/10/0,6, инв. № 4155 | 65 354 000 | 3 267 700 | 14 | Распределительное устройство, инв. № 500021 | 1 825 000 | 91 250 |
| 5 | Камера стационарного одностороннего обслуживания, инв. № 42523 | 3 865 000 | 193 250 | 15 | Распределительное устройство, инв. № 500022 | 1 825 000 | 91 250 |
| 6 | Камера стационарного одностороннего обслуживания, инв. № 42524 | 3 865 000 | 193 250 | 16 | Распределительное устройство, инв. № 500023 | 1 825 000 | 91 250 |
| 7 | Камера стационарного одностороннего обслуживания, инв. № 42525 | 3 865 000 | 193 250 | 17 | Распределительное устройство с подключенным высоковольтным кабелем АСБ 10-3х150 2 по 500-метров, инв. № 500024 | 18 891 000 | 944 550 |
| 8 | Распределительное устройство с подключенным высоковольтным кабелем АСБ 10-3х150 2 по 500 метров, инв. № 4149 | 18 891 000 | 944 550 | 18 | Распределительное устройство, инв. № 500025 | 1 825 000 | 91 250 |
| 9 | Распределительное устройство, инв. № 500016 | 1 825 000 | 91 250 | 19 | Счетчик, инв. № 43246 | 313 000 | 15 650 |
| 10 | Распределительное устройство, инв. № 500017 | 1 825 000 | 91 250 | 20 | Счетчик, инв. № 43247 | 313 000 | 15 650 |
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 18 января 2012 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2 | | | | | | |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **19 января 2012 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» | | | | | | |
| **Номер р/с для перечисления залога** | р/с 3012105618108 в РД № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 | | | | | | |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность | | | | | | |
| **Условия продажи** | Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 5%. | | | | | | |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс).**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**АДКАЗЫ НА СКАНВОРД**

**Па гарызанталі:** Гомель. Спакуса. Гродна. Тэма. Жабрак. Аксаміт. Арад. Цялушка. Этыка. Легат. Кулі. Бакара. Салака. Гама. Бук. Рад. Пікап. Камора. Раб. Нона. Нож. Сала. Палаш. Касір. Ірак. Лата. Спод. Магілёў. **Па вертыкалі:** Віцебск. Ава. Жулік. Абарона. Шыр. Марошка. Ліга. Рак. Абадан. Арал. Сіло. Костка. Ірад. Дог. Нерат. Панама. Ком. Актэт. Пыж. Макі. Арык. Кукабара. Ідал. Купал. Брэст. Ішак. Барысаў.

# НЕ ХАДЗІ СЮДЫ — ЗМЕІ!

**На Зміяным востраве ў Бразіліі жыве столькі ядавітых змей, што ўлады забаранілі яго наведванне.**



Размешчаны на ўзбярэжжы Бразіліі востраў Ilha de Queimada Grande мог бы стаць экзатычным схованкам для стомленых зімовымі халадамі турыстаў, курортам, што радуе гасцей гарачым сонечным надвор'ем і пляжамі. Аднак мясцовыя жыхары нездарма назвалі востраў Зміяным: тут водзяцца самыя небяспечныя віды ядавітых коп'егаловых змей — напрыклад, Golden Lancehead, яд якой выклікае хуткае адміранне тканін. Востраў настолькі небяспечны, што ўлады Бразіліі цалкам забаранілі яго наведванне.

Зрэшты, турысты і не рвуцца парушыць забарону — паводле статыстыкі, колькасць змей на востраве вагаецца ад адной да пяці ядавітых асобін на квадратны метр, таму верагоднасць смяротнага зыходу вельмі высокая. Аб Зміяным востраве ходзіць мноства страшных гісторый — напрыклад, пра рыбака, які вырашыў прыстаць да берага Ilha de Queimada Grande, быў укушаны змяёй і сышоў крывёй у сябе ў лодцы. Яшчэ больш трагічная доля спасцігла сям'ю вартаўніка маяка: уначы ў адасоблены катэдж на востраве праз вокны запаўзлі змеі, і людзі былі вымушаны ў паніцы ратавацца ад ядавітых гадзюк, прабіраючыся ўначы скрозь лес. Ніхто з іх не выжыў — целы няшчасных пазней былі знойдзены маракамі з прыстаўшага да вострава ваеннага карабля.

## Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

# ДАРОЖКА НЕ СУПАКОЙВАЕ

**На гары Цяньмэнь, размешчанай у кітайскай правінцыі Хунань на тэрыторыі аднайменнага парку, уладкаваная незвычайная дарожка для прагулак, якая прыйдзецца даспадобы аматарам вострых адчуванняў.**

Мала таго, што яна размешчана на вышыні каля 1,2 км над прорвай і цягнецца ўздоўж адвеснай сцяны на цэлых 70 метраў, дык яшчэ і пакрыццё зроблена са шкла. Праўда, шкло мае немалую таўшчыню — у 6 сантыметраў, і наўрад ці варта асцерагацца, што яно праломіцца. Але, мяркуючы па фота, некаторых наведвальнікаў гэта не моцна супакойвае. Дарожка была адкрыта нядаўна і замяніла сабой частку звычайнай, непразрыстай сцежкі, якая, відаць, падалася кіраўніцтву парку недастаткова ўражвальнай.

Кітайцы не першыя, хто зрабіў падобны падарунак для аматараў вострых адчуванняў. Так, у Вялікім Каньёне ў ЗША з 2007 года дзейнічае атракцыён Skywalk, які прапаноўвае наведвальнікам прагуляцца па шкляной арцы, якая «завісае» над каньёнам на вышыні больш за кіламетр — каля 1600 метраў. А ў Чыкага на ўзроўні 103-га паверха (412 метраў) аднаго з хмарачосаў зроблены цалкам празрысты балкон.



# «ТРУННАЕ» ЎПРЫГАЖЭННЕ

**Знакамітая круглая пірацкая завушніца ў вуху — гэта не проста ўпрыгажэнне. Па-першае, яна ўказвала на той факт, што яе носьбіт як мінімум раз перасякаў экватар. Па-другое, завушніца мела ўтылітарнае значэнне: калі пірат гінуў у моры, залатая завушніца павінна была служыць аплатай яго хаўтур.**

Жыццё марскога пірата было небяспечным, а шанцы згінуць невядома дзе ў баі або ў шторме — вельмі вялікімі. Цела загінулага ў моры магло ў ім і знікнуць, а магло быць выкінута на бераг. У гэтым выпадку высакародны пірат разлічваў быць пахаваным па хрысціянскім звычаі, расплаціўшыся за гэта сваёй завушніцай. Чым багацейшым быў разбойнік, тым буйнейшую завушніцу ён меў. Пэўна, звычай гэты сыходзіць каранямі ў старажытнагрэчаскія часы, калі за тое, каб трапіць у царства мёртвых, патрабавалася выплаціць Харону манетку за перавоз. Піраты сваімі завушніцамі жадалі аплаціць хрысціянскія хаўтуры, каб мець магчымасць патрапіць на той свет і паўстаць прад Судом Божым.



# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.23 | 16.47 | 7.24 |
| Віцебск — | 9.20 | 16.29 | 7.09 |
| Магілёў — | 9.13 | 16.37 | 7.24 |
| Гомель — | 9.00 | 16.43 | 7.43 |
| Гродна — | 9.36 | 17.04 | 7.28 |
| Брэст — | 9.28 | 17.13 | 7.45 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 18 снежня. Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Андрэя, Георгія, Івана, Мікалая, Савы, Фёдара.*

***К.*** *Аліцыі, Альбіны, Здзіслава, Себасцьяна, Яўсея.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




# 16 снежня

Дзве даты

**1730 год** — нарадзіўся Міхал Казімір Агінскі, дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай. Меў значную ролю ў культурным жыцці Беларусі, Літвы і Польшчы. З 1764 года — ваявода віленскі, з 1768-га — гетман вялікі літоўскі, адзін з кандыдатаў Кацярыны II на польскі трон. У 1771 годзе перайшоў на бок барскіх канфедэратаў, але яго атрад быў разбіты, і Агінскі эмігрыраваў. У 1775 годзе вярнуўся ў Беларусь. Жыў у Слоніме, дзе пабудаваў некалькі прадпрыемстваў, друкарню, стварыў оперны тэатр і капэлу. Пісаў музычныя і літаратурныя творы. Выдаў кнігу «Казкі і не казкі». Па яго ініцыятыве і на яго сродкі будаваўся Агінскі канал. Памёр у 1800 годзе.

**1773 год** — падзеі, якія адбыліся ў амерыканскім Бостане, увайшлі ў гісторыю пад назвай «Бостанскае чаяванне». Як вядома, усё зло ў свеце з-за грошай. У 70-х гадах XVIII стагоддзя англійскі кароль Георг III, задумаўшы ў чарговы раз паправіць сваё матэрыяльнае становішча за кошт суайчыннікаў, якія вырашылі шукаць лепшай долі ў землях Новага Свету, дайшоў да абсурду. Спачатку ён абклаў вельмі высокім падаткам пісьмы амерыканскіх каланістаў на сваю гістарычную радзіму. Амерыканцы абурыліся — і перасталі пісаць лісты наогул. Тады кароль выдаў указ аб тым, што каланісты маюць права купляць тавары толькі ў Англіі, а ўсе амерыканскія купцы, якія закупляюць тавары ў іншых краінах, павінны спачатку зайсці ў англійскія порты для мытнай праверкі. Апошняй кропляй, якая перапоўніла чашу цярпення каланістаў, стала прадастаўленне права Ост-Індыйскай кампаніі бяспошліннага ўвозу чаю ў Паўночную Амерыку. Амерыканцы, якія нічога не мелі супраць гарбаты, хоць і аддавалі перавагу каве, прыйшлі ў абурэнне: кароль, які жыве ў трох тысячах міль ад іх, мае нахабства ўказваць, што ім піць. Не кажучы ўжо пра тое, што падобныя дзеянні кіраўнікоў з далёкай радзімы сур'ёзна падрывалі эканоміку калоній. Задума Георга правалілася раптоўна: 16 снежня 1773 года пад покрывам ночы некалькі смельчакоў з арганізацыі «Сыны свабоды» пракраліся на англійскія караблі ў Бостанскім порце і выкінулі за борт усе 342 мяхі з выдатным англійскім чаем. Урад Вялікабрытаніі пастанавіў зачыніць порт Бостана да поўнага пакрыцця шкоды і накіраваў у Новую Англію ваенныя караблі. Гэтыя меры паслужылі сігналам да ўсеагульнага супраціўлення паўночнаамерыканскіх калоній і, у канчатковым выніку, утварэння ЗША.



Цытата дня:

***«Пастаянныя ваганні можна даравяць толькі маятніку».***

**Эміль Кроткі (1892—1963), рускі паэт-сатырык.**

# НОВЫ ГОД... СА ЗНІЖКАМІ І СЮРПРЫЗАМІ

**ЖЫХАРОЎ Віцебска перад святамі парадавалі навінамі аб значных святочных зніжках на тавары і паслугі, кругласутачнай рабоце транспарту ў навагоднюю ноч. Упершыню навагодняя ёлка будзе ўстаноўлена ў новым спальным мікраараёне, а на галоўнай плошчы горада таксама ўпершыню гараджан павіншуюць са святам «зоркі» эстрады.**

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» **намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Уладзімір ШЛОМА**, сёлета ў традыцыйным парадзе Дзедаў Марозаў і Снягурак (ён адбудзецца 23 снежня) возьмуць удзел аж 300 (!) пар гэтых казачных персанажаў. Потым на галоўнай плошчы горада разам з іншымі героямі казак яны запаляць галоўную навагоднюю ёлку вобласці. Тут выступяць «зоркі» беларускай эстрады: гурт «Дразды», Якаў Навуменка і іншыя.

Паводле слоў **галоўнага архітэктара горада Віцебска Віталя ДУБІКА**, сёлета па-новаму падышлі да афармлення ёлкі №1, вышыня якой 35 метраў. Увогуле ж горад упрыгожаць каля сарака ёлак і ўпершыню — піраміда, якую пабудавалі на вуліцы Леніна, у самым цэнтры горада.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» **Ірына СУПРУН, начальнік упраўлення гандлю і паслуг Віцебскага гарвыканкама**, шампанскага, цукерак і іншага для навагодняга стала хопіць на ўсіх. У Віцебску ўжо з 3 снежня на вуліцах пачалі працаваць навагоднія кірмашы. І асартымент прадукцыі вельмі запатрабаваны. Як заўважылі гандляры, людзі ахвотна купляюць мясную прадукцыю, рыбу. Цікава, што асаблівым попытам карыстаюцца беларускія яблыкі.

З 1 снежня па 20 студзеня ў адпаведнасці з распараджэннем аблвыканкама ўстаноўлены максімальны памер гандлёвай надбаўкі, уключаючы аптовыя на елкі штучныя, ёлачныя ўпрыгожванні, карнавальныя маскі, лыжы і санкі, у памеры 20 працэнтаў. На прадпрыемствах гандлю праводзяцца розныя акцыі. У прыватнасці, на прадпрыемстве «Віцебскія прадукты» вызначаны зніжкі да 40 працэнтаў на 100 найменняў тавараў. Яшчэ адно прадпрыемства — вядомы ў краіне лідар па продажах — прапануе «чырвоную цану» прыкладна на 130 відаў тавараў. У прамысловай сетцы значна больш стала тых прадпрыемстваў, што прапануюць набыць падарункавыя сертыфікаты коштам ад 100 тысяч рублёў і больш. Такую магчымасць, напрыклад, прапануе віцебскі ўнівермаг.

У Віцебску ўжо вызначаны спіс каля дваццаці пляцовак, дзе рэалізуюць жывыя елкі. Цэны на зялёныя прыгажуні — вышынёй да метра — ад 25 тысяч рублёў, ад метра да двух — 35 тысяч рублёў, да трох метраў — да 55 тысяч. Новая прапанова — елкі ў кадках — коштам ад 100 да 150 тысяч рублёў.

А вось у кавярнях і рэстаранах забаронена вызначаць мінімальны кошт заказаў, таму, у прынцыпе, можна абмежавацца кубкам чаю. Дзяржаўная «бытоўка» прапануе зніжкі на ўручэнне падарункаў Дзедам Марозам і Снягуркай, на фатаграфаванне і іншыя паслугі.

Паводле слоў **начальніка аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага гарвыканкама Валерыя КІРСАНАВА**, каб навесці парадак у перадсвяточным Віцебску, 17 снежня запланавана правесці агульнагарадскі суботнік.

Што тычыцца каткоў і пракату лыж... Як расказаў **Дзмітрый СКАРЫНКІН, начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму гарвыканкама**, у горадзе можна будзе пакатацца на пяцідзесяці лядовых пляцоўках, у тым ліку і на галоўным стадыёне вобласці. Дарэчы, дыяметр гэтай лядовай трасы 400 метраў. Акрамя таго, для ахвотных пакатацца, будзе арганізаваны выязны гандаль. Напракат яны змогуць узяць больш за 2 тысячы пар канькоў, лыж, а таксама санак.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ШЛЯХ «СВЕЧКІ» ДА НОВАГА МЕСЦА

**...Дарога да новага месца знаходжання абраза Міколы Угодніка аказалася зусім кароткай. Амаль што насупраць, цераз дарогу, стаяла хата сына той гаспадыні, у якой абраз знаходзіўся да гэтага часу. Мужчыны перайшлі вуліцу, зрабілі некалькі крокаў да брамы новага гаспадара і прыпыніліся. Аказалася, што месца перад брамай з'яўлялася яшчэ адной з найважнейшых рытуальных зон, у якой будуць разгортвацца прынцыпова значныя падзеі. Метра за паўтара ад брамкі стаялі муж і жонка, новыя гаспадары «Свечкі».**



● За некалькі крокаў да іх адна з прысутных жанчын кінула на пратаптаную ў снезе сцежку вывернуты мехам наверх чорны кажух. Мужчыны, якія трымалі абраз, зрабілі некалькі крокаў наперад і прыпыніліся так, што кажух апынуўся пад абразам. У той жа час малады мужчына (новы гаспадар ) апусціўся на калені і, трымаючы ў руках бохан хлеба, пачаў пралазіць пад іконай. За ім апусцілася на калені жонка і таксама пайшла ўслед за мужам. Мы, некалькі чалавек з Мінска, у тым ліку і студэнты ўніверсітэта, папрасілі дазволу далучыцца да выканання гэтага незвычайнага рытуальнага дзеяння. І — хто паўзком, хто на каленях, — таксама тройчы «прайшлі» пад абразам.

● Кожны міжволі аказаўся ўцягнутым у незвычайнае абрадавае дзеянне, якое адначасова зачароўвала і прывáблівала, паядноўвала і згуртоўвала сваёй магічнасцю і сакральнасцю. Бясконца шчоўкалі фотаапараты: усім хацелася зафіксаваць на памяць сваю далучанасць да шматгадовай абрадавай традыцыі і ціха, сам сабе, таксама папрасіць у Божага Угодніка Мікалая дапамогі і спагады.

● Пасля таго як усе ахвотныя прайшлі пад іконай, мужчыны, што трымалі яе на руках, рушылі далей. Яны зайшлі ў хату новых гаспадароў, паставілі абраз у чырвоны кут, перахрысціліся і выйшлі на вуліцу. Людзі зноў вярнуліся за святочны стол.

● Такім чынам мы ў чарговы раз дакрануліся да жывой традыцыі нашага народа. Традыцыі, якая паядноўвае людзей, дае ім веру і спадзяванне на тое, што запаветныя мары заўсёды збываюцца. Няхай іх веру асвячае полымя аброчнай свечкі, а галоўная святыня — абраз Міколы Угодніка — мацуе дух і ўсяляе надзею на тое, што ўнукі ўсіх, хто шануе мясцовую традыцыю, будуць здаровыя і шчаслівыя. Няхай і праз дзесяць гадоў падчас беларускага застолля прагучыць тост-надзея: «За святога Мікалая Цудатворца! Каб цуды ў нас не пераводзіліся!»

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Прыхапілі з мехдвара

**У в. Першамайскай (Бярозаўскі раён) на ўчастку прадпрыемства «Брэстдругчармет» былі затрыманы двое: майстар-будаўнік і інжынер, якія паспрабавалі збыць паўтары тоны металалому.**

Нічога ў гэтым кепскага не было б, калі б лом не ўкралі з мехдвара на прадпрыемстве ў в. Бакуны, дзе жывуць абодва здатчыкі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**



## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества** | **Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-19714 общей площадью 1956,6 кв.м** |
| **Собственник (владелец) имущества** | РСЧУП «Теплотехник-Орша» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Орша, ул. Ленина, 234а |
| **Стоимость имущества** | Лот № 1 — 737 946 000 белорусских рублей |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. «Правды», 32, 28 декабря 2011 года в 11.30 |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 304, http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс: (80212) 49 13 41, (8 029) 366 40 11, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 27.12.2011. Минимальная величина первого шага — 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1. Полуприцеп ВАНХОЛ гос. номер В 2333 А, 1992 года выпуска стоимостью 19 556 024 белорусских рубля.** |
| **Собственник (владелец) имущества** | Варапаева Татьяна Васильевна |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Полоцкий район, д. Лучно |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 321 11 января 2012 года в 15.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 321, http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич тел./факс: (80212) 49 13 43, (8 044) 734 93 00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович тел.: (80212) 49 13 40, (8044) 746 73 00 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, **не позднее 15.00 11.01.2012 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |



## Усміхнемся

Адэскае.

— Сёма! Вы ўмееце іграць на скрыпцы?

— Не.

— А ваш брат?

— Так.

— Што — так?

— Таксама не...

☺

**Самая вялікая студэнцкая хлусня: «Спіс выкарыстанай літаратуры».**

☺

Прымалі ў кантору праграміста. У анкеце ў графе пра наяўнасць у яго дзяцей напісаў: 6/9. Народ доўга чухаў патыліцу. І што толькі ні прыдумлялі: і што ў яго 6 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак, і што ў яго 6 жонак і 9 дзяцей, і што ў яго дзеці ад 6 да 9 гадоў. Потым у яго спыталі, што азначае гэты запіс. Адказ быў ашаламляльны:

— У мяне жонка на шостым месяцы.

☺

**З назіранняў урачоў-траўматолагаў. Ці ведаеце вы, што калі маладыя, узяўшыся за рукі, ідуць у ЗАГС, то, як правіла, у мужчыны на кісці застаюцца сінякі?**

☺

Жонка — мужу:

— Ты не знаходзіш, што агурочная маска дапамагае мне палепшыць знешні выгляд?

— Вядома, дарагая... Я вось толькі не разумею: навошта ты яе здымаеш?..




## ЧАЧЭРСКІ БАТАНІК

Пяць кішэняў, і кожная запоўнена здробненымі каноплямі. Нават аператыўнікі былі здзіўленыя, калі затрымалі 33-гадовага жыхара Чачэрска, напакаванага раслінннай атрутай. Экспертыза пацвердзіла, што зялёная маса з'яўляецца марыхуанай. Усяго ў кішэнях штаноў і курткі было знойдзена каля 200 грамаў небяспечнага рэчыва. Цяпер праводзяцца мерапрыемствы па выяўленні крыніцы паступлення наркотыку. Правяраецца і магчымасць дачынення затрыманага да распаўсюджвання канопляў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 6002. Нумар падпісаны ў 19.30 15 снежня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12